Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

7 ЛІПЕНЯ 2018 г. СУБОТА № 128 (28744)

ДЗІЦЯЧАЕ «ЕЎРАБАЧАННЕ» ВЫБІРАЕ 3

КРОПКІ АПОРЫ АЛЕНЫ СПІРЫДОВІЧ 15

ЦЫТАТА ДНЯ

Уладзімір ЖАЎНЯК, намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта:

«Сустрэчы кіраўнікоў усіх узроўняў з працоўнымі калектывамі вельмі важныя: у ходзе іх у людзей ёсць магчымасць данесці праблемы, якія складваюцца на месцах, а ў чыноўніка — пачуць і прыняць правільнае рашэнне, вырашыўшы складанае пытанне. Гэта важны момант у працы з насельніцтвам. Для таго мы і працуем, каб вырашаць праблемы простых людзей».

КАРАТКА

- Экспарт беларускай мясной прадукцыі ў студзені — маі вырас амаль на 15 %.
- **У Беларусі рыхтуюцца прапановы па абавязковым прадаўжэнні кантрактаў з добрасумленнымі работнікамі.**
- Фармзавод у Скідзелі (Гродзенская вобласць) будзе запушчаны ў эксплуатацыю ў кастрычніку. Гэта дазволіць павялічыць рост вытворчасці айчынных дэфіцытных лекаў для ўнутранага рынку і экспарту.
- **Сімвалічную «папараць-кветку» змогуць знайсці гамяльчане на свяце «Купалле» ў Чыгуначным раёне абласнога цэнтра ўвечары.**
- Кампанія Citroën анансавала першыя акуляры ад укалыхвання — Seetroën, якія ліквідуюць праблему з марской хваробай. У круглай аправе цячэ каляровая вадкасць, якая дапамагае нівеліраваць укалыхванне: вочы будуць бачыць гарызантальную лінію. Цана акуляраў у інтэрнэце — 99 еўра.

ПОЛАЦК З ВЫШЫНІ ПАЛЁТУ



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Маладая сям'я з Наваполацка Андрэй і Вольга Зубкі любяць вандраваць і занатоўваць свае ўражанні ў відэаблогу. На іхняй відэастаронцы ў сеціве мільён праглядаў, чатыры тысячы падпісчыкаў. А пачыналася з таго, як Вольга, працуючы ў цырульні, апублікавала матэрыял «зрабі сабе прычоску». Прагляд быў на сотні і тысячы. Потым Андрэй і Вольга сталі здымаць нашыя абласныя цэнтры — архітэктуру, людзей, цяпер прыехалі ў суседні Полацк, каб зверху зняць старажытны горад. Нядаўна яны набылі квадракоптар і асвойваюць гэты від фота і відэа.

— Наша захапленне ўмацоўвае нашу сям'ю, — кажуць новапалачане.

Дарэчы, пасля нараджэння ў сям'і двойні ў Андрэя і Вольгі захапленне блогерствам і відэаздымкамі стала яшчэ больш натхнёным. Гэта фота было зроблена на фоне славутай полацкай Сафіі.

«ЗАРАЗ УСЕ РУСАЛКІ ПЕРАВЯЛІСЯ»,

або Дзе захаваліся сапраўдныя цуды?

Чытачы, даўно знаёмыя са «Звяздой», памятаюць, як у 90-я газета пісала пра НЛА, а на пачатку нулявых у ёй была нават містычная рубрыка «777». У сакавіку 1990-га рэдакцыя атрымала цэлы шэраг пісем ад чытачоў пра пралёт агнявых шароў, а таксама чырвоных квадратаў у раёне Мастоў. Апошнім часам такіх навін стала менш. У чым жа справа і ці не зніклі цуды з Беларусі, мы спыталі ў Ілы БУТАВА, каардынатара суполкі «Уфакам» (ufo-com.net).

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

ПАЛЕСКІЯ ЦІКАВОСТКІ

— Кожны сезон вы накіроўваецеся ў розныя экспедыцыі. Чым сёлетні для вас адметны?

— Ён прысвечаны двум асноўным напрамкам. Яны стартавалі ў канцы мінулага года і плаўна перацяклі ў 2018-ы. Першы напрамак я развіваю асабіста — гэта тэма цудаў. Адсочваю заканамернасці з'яўлення цудаў на тэрыторыі Беларусі. Гэтаму паклала пачатак мая кніжка, якая выйшла зімой, — «Арэал цудаў». Падчас напісання выявіліся раёны, дзе цудаў непараўнальна, я нават сказаў бы, што ў дзесяткі разоў больш, чым у іншых пунктах. І вось зараз, валодаючы гэтай інфармацыяй, мы ездзім у канкрэтныя месцы. Рухаючыся па распрацаваным загадзя маршруце, мы адсочваем і фіксуем незвычайныя з'явы. У нашых планах — далейшае развіццё гэтай тэмы і абагуленне ў межах краіны. Ужо прайшлі экспедыцыі ў некалькіх раёнах — Вілейскім, Уздзенскім, Капыльскім, Валожынскім...

СТАР. 13

■ Кар'ера

ХТО НЕ РЫЗЫКУЕ, ТОЙ НЕ НАЧАЛЬНІК

Што перашкаджае жанчынам быць кіраўнікамі

У беларускіх банках суадносіны супрацоўнікаў — жанчын і мужчын — прыкладна 80 на 20. Але старшынямі праўлення з'яўляюцца пераважна прадстаўнікі дужага полу. Чаму? Як заўважаюць эксперты, прабівацца на вядучыя пасады спадарыням складана не толькі з-за стэрэатыпаў у грамадстве і двайной, з улікам хатніх спраў, нагрузкі.

З праблемамі ў прасоўванні па кар'ернай лесвіцы сутыкаюцца жанчыны ў розных краінах. Сара Кілінг, кіруючы дырэктар міжнароднай кампаніі BRG, 23 гады працавала ў дзяржаўным сектары і адзначае, што прадстаўніц прыгожага полу ў кіраўніцтве насамрэч мала.

— У сярэднім звяне іх 40 працэнтаў, а на вядучых пасадах — 10, — падзялілася яна назіраннямі падчас форуму Feminominal, які праходзіў у Мінску. — Калі пачынала працаваць, даводзілася падстройвацца пад мужчын. Але жанчыны здольныя прыўнесці іншы падыход у работу.

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 18128

■ Парламенцкі дзённік

АБАВЯЗКОВА МІР

Дэлегацыя Беларусі возьме ўдзел у 27-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ

Беларускія парламентарыі на чале з намеснікам старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Баляславам Пірштуком адправяцца ў Берлін, дзе з 7 па 11 ліпеня пройдзе чарговая сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе.

У склад айчыннай дэлегацыі ўваходзяць старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па міжнародных справах і нацыянальнай бяспецы Сяргей Рахманаў і старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Валерый Варанецкі.

Цэнтральнай тэмай сесіі стане выкананне абавязацельстваў у рамках АБСЕ і роля парламентаў у гэтым. Мерапрыемства прысвечана абмеркаванню пытанняў прыняцця дзяржавамі-ўдзельніцамі эфектыўных заканадаўчых мер, накіраваных на ўмацаванне міжнароднага супрацоўніцтва і выкананне абавязацельстваў у дачыненні да падтрымання міру і бяспекі ў рэгіёне АБСЕ.

Запланаваны і шэраг двухбаковых сустрэч — як з кіраўнікамі і членамі дэлегацый дзяржаў — удзельніц арганізацыі, так і з іншымі афіцыйнымі асобамі.

Вынікам сесіі стануць выбары — старшыні ПА АБСЕ, яго намеснікаў, іншых службовых асоб. Таксама будзе прынятая Берлінская дэкларацыя, у якую ўвойдуць тры рэзалюцыі агульных камітэтаў ПА АБСЕ, а таксама шэраг дадатковых рэзалюцый.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ

■ Факт і каментарый

ПРОДАЖ ДАЎГОЎ, МАЛЕНЬКІХ І НЕ ВЕЛЬМІ

У Беларусі пачаў дзейнічаць інстытут сек'юрытызацыі

Як вядома, з першых дзён ліпеня ў нашай краіне ўступіў у сілу Указ № 54 «Аб фінансаванні камерцыйных арганізацый пад уступку правоў (патрабаванняў)». Дзякуючы гэтаму дакументу ў краіне пачне працаваць інстытут сек'юрытызацыі — новы для нашага рынку механізм прыцягнення фінансавання для банкаў і іншых арганізацый.

АКТЫВЫ БАНКА — У «ЖЫВЫЯ» ГРОШЫ

— Калі казаць максімальна проста, то сек'юрытызацыя — гэта продаж даўгоў. Ажыццяўляецца гэты працэс праз спецыяльную фінансавую арганізацыю, — тлумачыць **Жанна КУЛАКОВА, фінансавы кансультант TeleTrade.** — Дапусцім, ёсць банк, які калісьці выдаў мноства крэдытаў на нерухомасць. Ён ужо атрымаў на гэтым нейкі прыбытак, а цяпер хоча вызваліць грошы, «замарожаныя» ў крэдытах, і зноў пусціць іх у абарот. Для гэтага выдадзеныя крэдыты пераводзяцца на баланс спецыяльнай фінансавай арганізацыі (СФА), а яна ўжо выпускае аблігацыі на суму гэтых пазык. Далей аблігацыі прадаюцца ўсім ахвотным інвестарам. Грошы ад продажу атрымлівае банк.

Што мы маем у дадзеным выпадку? Цяпер былыя даўжнікі банка сталі даўжнікамі гэтай самай СФА. Яны будуць, як і раней, плаціць па сваіх крэдытах, а спецыяльная арганізацыя за кошт гэтых сродкаў у будучыні пагасіць выпушчаныя аблігацыі. Аналагічным чынам можна прадаваць не толькі банкаўскія крэдыты, але і, напрыклад, дэбіторскую запазычанасць кампаній.

ДАЎГІ СА ЗНІЖКАЙ

Пры гэтым продаж даўгоў у рамках сек'юрытызацыі, як правіла, адбываецца з дысконтам, або, інакш кажучы, са зніжкай. Гэта азначае, што СФА будзе павінна вярнуць банку менш грошай, чым каштуе крэдытны партфель, які быў сек'юрытызаваны. Умоўна, калі банк пераводзіць на баланс спецыяльнай арганізацыі 100 млн рублёў, то СФА заплаціць банку не 100 млн, а 99 млн, 98 млн або менш — у залежнасці ад таго, наколькі вялікія рызыкі па дадзеным крэдытным партфелі. Памер дысконту для кожнага канкрэтнага выпадку абмяркоўваецца індывідуальна.

АЧЫСЦІЦЬ ПАРТФЕЛІ БАНКАЎ

З-за гэтага сек'юрытызацыя не вырашыць праблемы дрэнных даўгоў: калі даўжнік не плаціў па крэдыце банку, то і спецыяльнай арганізацыі ён сапраўды гэтак жа не будзе плаціць. Гэта ўсе разумеюць, і сек'юрытызацыя такіх актываў магчымая толькі з вельмі значным дысконтам. А значыць, банк у любым выпадку панясе фінансавыя страты. Такім чынам, сек'юрытызацыя можа чыста тэхнічна ачысціць партфелі банкаў ад праблемных актываў, але не застрахуе банкі ад страт. Галоўным плюсам сек'юрытызацыі з'яўляецца магчымасць ператварыць актывы банка або іншай арганізацыі ў жывыя грошы. Таксама яна дасць стымул для развіцця рынку каштоўных папер. Акрамя таго, дзякуючы сек'юрытызацыі з'явіцца магчымасць драбіць буйныя крэдыты на дробныя часткі і прадаваць іх розным інвестарам, і наадварот — магчымасць аб'ядноўваць мноства дробных пазык у адзін выпуск аблігацый.

Сяргей КУРКАЧ

■ Фінансы

Знешні доўг паменшыўся на 2 %

Як паведамілі ў Міністэрстве фінансаў, па стане на 1 чэрвеня знешні дзяржаўны доўг склаў 16,4 млрд долараў, зменшыўшыся з пачатку года на 332 млн долараў (з улікам курсавых розніц).

У студзені — маі прыцягнуты знешнія дзяржаўныя пазыкі на суму 1 млрд 64,9 млн долараў, у тым ліку 600 млн долараў — еўрааблігацыі, 377 млн долараў — урада і банкаў Расіі, 52,7 млн долараў — Міжнароднага банка рэканструкцыі і развіцця (МБРР), 33,1 млн долараў — банкаў Кітая. Пагашэнне знешняга дзяржаўнага доўгу з пачатку года склала 1 млрд 309,9 млн долараў, з якіх 800 млн долараў — еўрааблігацыі, 213,4 млн долараў — банкам КНР, 174,6 млн долараў — ураду Расіі, 88,3 млн долараў — Еўразійскаму фонду стабілізацыі і развіцця, 32,5 млн долараў — МБРР.

Сяргей КУРКАЧ

■ Векапомнае

Сімвал мужнасці і славы

Алею мужнасці і адвагі днямі ўрачыста адкрылі ў Нясвіжы

Яна створана ў гонар 100-годдзя Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь і 30-годдзя выводу савецкіх войскаў з Афганістана.

— На тэрыторыі раёна пражывае больш за сто воінаў-інтэрнацыяналістаў, у тым ліку 97 «афганцаў». У нашых сэрцах заўсёды захоўваецца памяць аб тых, хто не вярнуўся на родную зямлю. Мы ўпэўнены, што дагледжанымі абеліскамі, мемарыяльнымі комплексамі мы з вамі зможам перадаць маладому пакаленню крупінкі нашай гісторыі, — звярнуўся да жыхароў горада і раёна старшыня райвыканкама Генадзь Салавей. — А падрастаючае пакаленне будзе працягваць справу па захаванні памяці тых, хто аддаў жыццё за светлую будучыню. Мы шмат робім у раёне, каб увекавечыць подзвіг нашых землякоў, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны, выконвалі свой інтэрнацыянальны абавязак. У наступным годзе мы плануем на гэтым месцы ўладкаваць сквер і ўшанаваць памяць загінулых ад рук карнікаў у гады Вялікай Айчыннай вайны.

З сёлетняга мая ідуць раскопкі пахавання ў Нясвіжы ваеннаслужачымі 52-га асобнага спецыялізаванага пошукавага батальёна Міністэрства абароны. Ужо выяўлены астанкі больш як 900 чалавек. У гэтым катлаванне смерці знайшлі апошні прытулак старыя, жанчыны, дзеці. Магчыма, гэта і ёсць тое месца, дзе былі расстраляныя 1200 чалавек, пра гібель якіх згадваецца ў кнізе «Памяць. Нясвіжскі раён». Сярод мірных грамадзян знойдзены і астанкі 31 чырвонаармейца, і пяць апазнавальных медальёнаў. Ёсць надзея, што яны дадуць магчымасць высветліць імёны байцоў.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

РАСПАЧАЛАСЯ НАЙБУЙНЕЙШАЯ Ў ГІСТОРЫІ ГАНДЛЁВАЯ ВАЙНА

Кітай і ЗША абмяняліся гандлёвымі пошлінамі на тавары агульнай сумай $68 млрд. «ЗША 6 ліпеня ў 00.01 па мясцовым часе ўвялі ўвазную пошліну на імпарт 818 найменняў тавараў з Кітая агульным аб'ёмам у $34 млрд. У якасці контрмеры Кітай у гэты ж дзень увёў пошліну ў 25 % на імпарт раўназначнага аб'ёму амерыканскіх тавараў», — гаворыцца ў заяве галоўнага мытнага ўпраўлення КНР. «Увядзенне пошлін з'яўляецца прыкладам гандлёвага запалохвання. ЗША парушылі нормы СГА і далі пачатак самай вялікай па аб'ёме гандлёвай вайне ў гісторыі эканомікі. Гэта наносіць сур'ёзную шкоду бяспецы глабальных вытворчых ланцужкоў і перашкаджае працэсу аднаўлення сусветнай эканомікі», — падкрэсліваецца ў афіцыйнай заяве міністэрства камерцыі КНР. Кітайскі бок заявіў, што «для абароны карэнных інтарэсаў дзяржавы і выгады кітайскага народа вымушаны пайсці на неабходны ўдар у адказ». Эксперты папярэджваюць, што далейшы рух па шляху эканамічнай вайны паміж Пекінам і Вашынгтонам пагражае рэцэсіяй для ўсёй сусветнай эканомікі. Юань ужо «патанеў» на 3,5 % у адносінах да долара, а азіяцкія біржы рызыкуюць «прасесці» ўслед за кітайскімі індэксамі.

ТЭГЕРАН ПАГРАЖАЕ ЗАКРЫЦЬ АРМУЗСКІ ПРАЛІЎ

Пра магчымасць закрыцця найважнейшага праліва, па якім транспартуецца пакупнікам нафта з Персідскага заліва, заявіў прэзідэнт Ісламскай Рэспублікі Іран Хасан Рухані, які цяпер знаходзіцца ў Еўропе і спрабуе выратаваць здзелку па ядзернай праграме Ірана. Іранскі прэзідэнт лічыцца на Захадзе памяркоўным палітыкам і рэфарматарам, але пасля аднабаковага выхаду з пагаднення Вашынгтона ён пад моцным ціскам іранскіх кансерватараў на чале з аяталой Алі Хаменеі, падобна, таксама заняў жорсткую пазіцыю. Праз некалькі гадзін пасля гучнай заявы Рухані генерал-маёр Касам Сулеймані, адзін з камандзіраў Вартавых іранскай рэвалюцыі, найбольш баяздольнага падраздзялення іранскай арміі, і ўдзельнік баявых дзеянняў у Сірыі і Іраку, паведаміў журналістам, што яго падначаленыя ў любую хвіліну гатовыя выканаць загад Рухані і Хаменеі.

СВЕТ НАКРЫЛІ ЦЕПЛАВЫЯ ХВАЛІ

Экстрэмальная спякота, якая ахапіла розныя раёны Канады, ЗША, Блізкага Усходу, Вялікабрытаніі і іншых еўрапейскіх краін, б'е тэмпературныя рэкорды, наносіць шкоду сельскай гаспадарцы, становіцца прычынай пажараў і выклікае сур'ёзную трывогу ў медыкаў. У аманскім пасёлку Кураят гэтымі днямі было зафіксавана самае высокае значэнне мінімальнай сутачнай тэмпературы — плюс 42,6 градуса. Перыяды моцнай спякоты, або, як іх называюць у англамоўных краінах, цеплавыя хвалі (англ. heatweave) — з'ява не ўнікальная. Сіноптыкі фіксуюць іх рэгулярна. Але іх частата, працягласць і — у некаторых рэгіёнах — вільготнасць, якая іх суправаджае, маюць тэндэнцыю да росту.

У ЯПОНІІ ПАВЕСІЛІ КІРАЎНІКОЎ СЕКТЫ «АУМ СІНРЫКЁ»

У Японіі пакараны смерцю заснавальнік рэлігійнай секты «Аум Сінрыкё» Сёка Асахара (ён быў прысуджаны да смяротнага пакарання яшчэ ў 2004-м), а таксама некалькі кіраўнікоў арганізацыі, адказнай за найбуйнейшы тэракт у японскай гісторыі. У сакавіку 1995 года сектанты распылілі атрутны газ зарын у такійскім метро, у выніку чаго загінулі 13 чалавек і пацярпелі каля 6 тысяч. Акрамя Асахары пакараныя Кіёхідэ Хаякава, які выконваў у секце ролю ваеннага міністра, а таксама Тамаса Накагава і Ёсіхіры Іноўэ. Усе прыгаворы прывядзены ў выкананне праз павешанне. Як вядома, рэлігійная секта «Аум Сінрыкё» была заснавана ў 1987 годзе Сёка Асахарай. Колькасць удзельнікаў, па розных звестках, дасягала ад 30 да 50 тысяч чалавек, з іх значная частка знаходзілася ў Расіі, дзе сектанты вялі актыўную дзейнасць.

■ Ведай нашых!

НАЙЛЕПШЫЯ. СЯРОД КНІГ

Гран-пры XV Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» краін СНД у выдання «А хто там ідзе?»

Гэта кніга выпушчана «Беларускай Энцыклапедыяй імя Петруся Броўкі» і ўяўляе сабой перакладны знакамітага верша Янкі Купалы на 100 моў свету, якія рабіліся пераважна носьбітамі гэтых моў. Аўтарамі, якія пісалі тлумачэнні да кнігі, з'яўляюцца прафесар Вячаслаў Рагойша і дырэктар Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы Алена Ляшковіч. Акрамя гэтай перамогі беларусы атрымалі і многа іншых каштоўных узнагарод. Члены журы міркуюць, што наша краіна сёлета проста скарыла конкурс!

Як адзначыў дырэктар выдавецтва «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі» Уладзімір Андрыевіч, у дзевяці намінацыях конкурсу Беларусь атрымала найвышэйшыя, першыя, узнагароды, яшчэ ў адной намінацыі — узнагароды другой ступені. І гэта вельмі істотны вынік, бо ўсяго на конкурс было прадстаўлена болей за 100 кніг: кожная краіна магла прэзентаваць па дзве кнігі ў адной намінацыі. Таму журы міжнароднага форуму адзначыла, што сёлета адбыўся сапраўдны трыумф беларускай кнігі. «Можна сказаць, што ў нас нават не было сур'ёзных канкурэнтаў, — адзначыў Уладзімір Андрыевіч. — Бо беларусы любяць кнігу і хочуць прадстаўляць яе найлепшыя ўзоры».

Выдавецтва «Народная асвета» атрымала дзве першыя ўзнагароды ў намінацыях «Кніга для дзяцей і юнацтва» і «Дыялог культур». Так, адным з пераможцам стала выданне «Буранны паўстанак. І вякуе дзень даўжэй за век» Чынгіза Айтматава. Гэта твор, перакладзены на беларускую мову Міхасём Стральцовым. Мастаком выдання з'яўляецца Арлен Кашкурэвіч.

У намінацыі «Арт-кніга» найлепшай прызнана кніга старшыні Беларускага саюза мастакоў Рыгора Сітніцы «Звычайныя рэчы», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда».

У намінацыі «Арт-кніга» найлепшай прызнана яшчэ адно беларускае выданне — кніга старшыні Беларускага саюза мастакоў Рыгора Сітніцы «Звычайныя рэчы», якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Дызайн для яго выканаў Зміцер Герасімовіч, што, па словах аўтара, стала адным з ключоў да поспеху. Дарэчы, не так даўно ў Рыгора Сітніцы выйшаў і зборнік паэзіі пад назвай «Ток». Наклад у 500 асобнікаў разышоўся за тры месяцы, прэзентацыя ў вялікай зале сталічнай філармоніі сабрала аншлаг. Таму цяпер зборнік плануюць перавыдаваць, магчыма нават не адзін раз, і прэзентаваць у абласных гарадах.

Нельга абмінуць увагай і яшчэ аднаго сёлетняга важнага пераможцу міжнароднага конкурсу — гэта кніга Валянціны Бялявінай і Любові Ракавай «Беларускі касцюм», выпушчаная ў выдавецтве «Беларусь». Як адзначае Любоў Ракава, цяпер часцей за ўсё вывучаюць сялянскі касцюм, і гэта цалкам натуральна, бо захаваліся многія яго ўзоры. Аднак у сваёй кнізе яны звярнулі ўвагу на шляхецкае адзенне і імкнуліся падкрэсліць, якія багатыя традыцыі маюць беларусы.

Без перабольшання, надзвычай важная кніга, якая стала пераможцай у намінацыі «Садружнасць», — гэта выданне «Беларускі след у гісторыі і культуры Масквы», што выйшла ў выдавецтве «Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі». Як адзначыла адна з яе аўтараў, доктар мастацтвазнаўства, прафесар Вольга Бажэнава, гэта выданне зрабіла крок наперад у міжкультурным дыялогу і прызнанні ўнёску беларускіх рамеснікаў у стварэнне і аздабленне многіх архітэктурных цікавінак Масквы.

На конкурсе «Мастацтва кнігі» краін СНД было прадстаўлена і шмат іншых цікавых выданняў з Беларусі, якія таксама не засталіся без узнагарод.

Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ

ФРАНЦЫЯ — ПЕРШЫ ПАЎФІНАЛІСТ

Учора ў першым матчы 1/4 фіналу чэмпіянату свету па футболе зборная Францыі абыграла каманду Уругвая з лікам 2:0.

FIFA WORLD CUP RUSSIA 2018

У лацінаамерыканцаў з-за траўмы не змог выйсці на поле герой 1/8 фіналу нападаючы Эдысан Кавані, і гэта, зразумела, збянтэжыла іх атаку. У французаў быў поўны баявы склад, але абарона ўругвайцаў доўга не дазваляла стварацца небяспеку сваім воротам. Аднак каманда Уругвая забыла пра абаронцаў саперніка, і менавіта адзін з іх — Рафаэль Варан — і адкрыў лік у матчы. На 40-й хвіліне ў яго атрымаўся прыгожы ўдар галавой.

У другім тайме лацінаамерыканцы кінуліся адыгрывацца, стваралі вастрыню каля варот саперніка, але ў самыя адказныя моманты ці прамахваліся з выгодных пазіцый, ці забіць ім не дазвалялі французы. А на 61-й хвіліне нескладаны ўдар форварда трохкаляровых Антуана Грызмана з-за памылкі ўругвайскага галкіпера Фернанда Муслеры прывёў да другога гола. Адыграцца Уругваю не ўдалося, і Францыя стала першым паўфіналістам ЧС-2018 і чакала пераможцу пары Бразілія — Бельгія.

Дарэчы, варатар Францыі Уга Льярыс у матчы быў атакаваны вялікай страказой. Насякомае імкліва ўляцела галкіперу ў рот, што той нават не адразу зразумеў, што адбылося, але хутка выплюнуў яго. Аператары паспелі зняць эпізод і паказаць усяму свету.

Іван КУПАРВАС.

НЕСПРЫЯЛЬНЫЯ ДНІ І ГАДЗІНЫ Ў ЛІПЕНІ

7, субота, 9.00 – 15.00	**17, аўторак, 13.00 – 21.30**
9, панядзелак, 10.00 – 15.30	**20, пятніца, 0.00 – 3.30**
10, аўторак, 21.30 – 24.00	**22, нядзеля, 11.30 – 14.30**
11, серада, 0.00 – 17.00	**24, аўторак, 10.30 – 23.00**
13, пятніца, 5.00 – 19.30	**26, чацвер, 16.00 – 24.00**
15, нядзеля, 0.00 – 18.00	**27, пятніца, 0.00 – 12.30**
	29, нядзеля, 11.30 – 24.00

■ Рэпартаж у нумар

ХАЧУ — І СПЯВАЮ!

У Белтэлерадыёкампаніі адбылося праслухоўванне прэтэндэнтаў на дзіцячае «Еўрабачанне-2018».

Падрыхтоўка да міжнароднага дзіцячага песеннага конкурсу, які сёлета прымае наша краіна, набірае абароты. На дадзены момант яшчэ не вызначылася канчаткова колькасць яго ўдзельнікаў — неафіцыйна свой удзел пацвердзілі 15 краін, у тым ліку Азербайджан, які плануе вярнуцца пасля перапынку, і Францыя, якая выступіць на дзіцячым шоу ўпершыню. Але ўжо даводзяцца да ладу ўсе арганізацыйныя моманты, разглядаюцца варыянты афармлення сцэнічнай пляцоўкі і распрацоўваецца праграма знаходжання замежных дэлегацый у нашай краіне. І канешне, з вялікай адказнасцю арганізатары падыходзяць да выбару прадстаўніка Беларусі: 62 заяўкі на нацыянальны адбор даслалі юныя выканаўцы і калектывы з Мінска, Магілёва, Брэста, Віцебска, Гомеля, Жодзіна, Ашмян...

Учора ўсе кандыдаты атрымалі магчымасць выступіць жыўцом перад журы, куды ўвайшлі прадстаўнікі Белтэлерадыёкампаніі і Міністэрства культуры, а таксама вядомыя артысты: заслужаная артыстка Беларусі Наталля Тамела, спявачка і тэлевядучая Вольга Рыжыкава, спявачка Ганна Шаркунова, саліст гурта «Атлантыка» Аляксей Набееў.

Здагадацца аб тым, што на Макаёнка, 9 адбываецца

нешта надзвычайнае, можна было яшчэ перад дзвярыма: адусюль сцякаліся групкі дзяцей і дарослых з куфрамі для сцэнічных касцюмаў, у вялізнай чарзе на ўваход мільгалі яркія прычоскі і чуліся музычныя фрагменты ад самых нецярплівых. Прэтэндэнты, якім, паводле ўмоў конкурсу, ад 9 да 14 гадоў, распаўсюдна: у фае і ў грымёрках, на прыступках, на крэслах у чаканні свайго выхаду... Сярод настаўнікаў, якія суправаджалі сваіх выхаванцаў, мы заўважылі шэраг вопытных «байцоў» дзіцячага «Еўрабачання»: спявачку Вольгу Уронскую і ўдзельніка дарослага «Еўрабачання-2015» Юрыя Наўроцкага, ён жа Юзары; прадзюсараў і педагогаў Святлану Стацэнку, Іну Радаеву, Наталлю Рамана-ву, Вольгу Драздову...

— Здаецца, перажываю больш, чым за сябе, — прызнаўся фіналіст адбору на «Еўрабачанне-2018» Алег Шчуцкі (вядомы пад сцэнічным псеўданімам Alen Hit), — хоць сёння выступаю толькі як аўтар песні для Ліліяны Садоўскай. А яна малайчына, наадварот, зусім не нервуецца.

Дарэчы, многія іншыя сёлетнія прэтэндэнты, як і Ліліяна, добра вядомыя не толькі заўсёднікам «Еўрабачання», але і аматарам папулярнай музыкі наогул: за плячыма ў гэтых дзяцей паспяховыя выступленні на тэлешоу «Голас. Дзеці», «Славянскім базары ў Віцебску», «Дзіцячай Новай хвалі»... Так, некалькі гадоў запар падаюць заяўкі Яраслаў Саколікаў, Марыя Жыліна, Марыя Магільная, Аліна Пехцерава, Стафанія Сакалова; вырашыў рызыкнуць і паспрабаваць свае сілы ўдзельнік дзіцячага конкурсу «Славянскага базару ў Віцебску — 2018» Арцём Скароль.

13-гадовая Аляксандра Цяпліна з Магілёва — адна з нямногіх, за чыімі плячыма не стаіць вопытны прадзюсар або педагог з імем. Але саму дзяўчыну гэта ніколькі не засмучае: «Я спяваю з чатырох гадоў, разумею, што гэта «маё», і спрабую свае сілы ў розных конкурсах. Часта выступаю на адной сцэне і з вельмі вядомымі ўдзельнікамі, гэта дапамагае адчуваць, як расце ўласны творчы ўзровень. Таму, нават калі я не прайду ў фінал, нічога страшнага, усё адно атрымаю карысны вопыт». Але такія вытрымка і правільны настрой былі далёка не ва ўсіх — за кулісамі нам давялося пабачыць і смех, і слёзы.

— Не зайздрошчу я журы, — зазначыў у перапынку спявак Юзары, назіраючы гэты зорны россып талентаў.

— Ты ж летась сам «журыў», — нагадалі калегі па сцэне.

— Вось таму і не зайздрошчу. Выбраць з такой колькасці максімум 10 фіналістаў — ну як?!

Сапраўды, старшыня журы Наталля Тамела ўжо на палове канкурсантаў прызналася, што адчувае разгубленасць: «Надзвычай высокая канкурэнцыя сёлета, ёсць моцныя і салісты,

і калектывы. Некаторыя толькі выходзяць на сцэну, і ты разумееш, што ўсё супала: песня, голас, сцэнічны вобраз — але па многіх выканаўцах, думаю, у нас будуць гарачыя спрэчкі».

Фінальны гала-канцэрт, пераможца якога і прадставіць Беларусь на міжнародным конкурсе, пройдзе, як даведалася «Звязда», у канцы жніўня.

Кампетэнтна

— Дзіцячае «Еўрабачанне» ўжо праходзіла ў Мінску ў 2010 годзе, і тое шоу было прызнана адным з найлепшых за ўсю гісторыю, таму перад намі, канешне, стаіць няпростая задача ўтрымаць высокую планку, — зазначае **старшыня Белтэлерадыёкампаніі Іван ЭЙСМАНТ.** — Таму падрыхтоўка ідзе грунтоўная і карпатлівая, літаральна штодня. Як вы ведаеце, мы ўжо выбралі лагатып і слоган Light Up! — Запальвай! Ён вельмі спадабаўся Еўрапейскаму вяшчальнаму саюзу, і, мяркую, вакол гэтай ідэі будзе круціцца ўсё шоу, поўнае 3D, тэхнічных навінак і відовішчных спецэфектаў. Таксама абавязкова скарыстаем нацыянальныя беларускія матывы. Пастараемся зрабіць усё, каб максімальная колькасць маленькіх беларусаў змагла трапіць на дзіцячае «Еўрабачанне». А што датычыцца адбору — тут мы не ставім занадта жорсткіх планак. Як можна патрабаваць ад дзяцей выключна перамогі? Галоўнае, каб той выканаўца ці калектыў, якіх абяруць журы і гледачы, самі атрымалі задавальненне на сцэне і годна прадставілі Беларусь.

Па выніках праслухоўвання фіналістамі адборачнага тура сталі:

1. Арцём Скароль (г. Ашмяны, Гродзенская вобласць), «Усміхніся»;
2. Лізавета Мея (г. Жодзіна, Мінская вобласць), «Зорка»;
3. Марыя Гулевіч (г. Мінск), «Вострaў Чыкарум»;
4. Данііэль Алекс Ястрэмскі (г. Мінск), Time;
5. Анжаліна Ярашчук (г. Мінск), Feeling Good;
6. Група «Мята» (г. Мінск), «Аднойчы»;
7. Мікіта Бялько (г. Мінск), «Не аддай»;
8. Марыя Жыліна (г. Мінск), Welcome To My Belarus;
9. Яраслаў Саколікаў (г. Мінск), «Свет на зямлі»;
10. Monkey Tops (г. Мінск), «На стылі».

Лёсаванне фіналістаў, якое вызначыць чарговасць выступлення ў канцэрце, пройдзе ў Белтэлерадыёкампаніі 7 ліпеня ў 12.00.

Вікторыя ЦЕЛЯШУК. Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Больш здымкаў глядзіце на нашым сайце zviazda.by

■ Добры звычай

СВЯТА «Ў КВАДРАЦЕ»

Віншаванні і падарункі ад «Белай Русі» атрымалі матулі, чые дзеці нарадзіліся трэцяга ліпеня

Дзень Незалежнасці стаў адначасова і днём нараджэння для 181 маленькага грамадзяніна Беларусі. Па традыцыі ў кожным рэгіёне краіны павіншаваць маладых маці з двайным святам прыйшлі члены ўрада, дэпутаты, кіраўнікі адміністрацый раёнаў.

Падчас акцыі «Белая Русь — з любоўю да дзяцей» прадстаўнікі арганізацыі разам з іншымі адказнымі асобамі наведалі пяць медыцынскіх устаноў Мінска. Напрыклад, толькі ў Рэспубліканскім навукова-практычным цэнтры «Маці і дзіця» адбылася сустрэча з 15 мамамі. Акрамя добрых слоў, жанчыны атрымалі падарункі — падушкі і коўдрачкі для немаўлят.

Злева направа. Дырэктар РНПЦ «Маці і дзіця» Канстанцін ВІЛЬЧУК, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Генадзь ДАВЫДЗЬКА, кіраўнік адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Дзмітрый ПЯТРУША.

Намеснік дырэктара па акушэрстве і гінекалогіі РНПЦ «Маці і дзіця» Святлана НАГІБОВІЧ.

Генадзь ДАВЫДЗЬКА, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі, старшыня РГА «Белая Русь», адзначыў, што акцыя насамрэч не аднамаментная і дзеці могуць разлічваць на далейшую падтрымку:

— За лёсам маленькіх грамадзян будзем сачыць ад першага і да апошняга званка ў школе, па меры магчымасцяў дапамагаць у жыцці. «Белая Русь» дзясяты раз праводзіць падобную акцыю, і мне хацелася б пажадаць дзецям, што з'явіліся на гэты свет у дзень самага важнага для нашай краіны свята, каб яны былі любімымі і значнымі для сваіх бацькоў, важнымі і запатрабаванымі для Беларусі і свету.

На думку **кіраўніка адміністрацыі Цэнтральнага раёна Мінска Дзмітрыя ПЯТРУШЫ,** вельмі сімвалічна вітаць дзяцей у Дзень Незалежнасці, бо аснова любой краіны — гэта яе жыхары.

Самім маладым маці акцыя таксама спадабалася. **Вольга ШКЛЯННІК** трымае на руках маленькую **Кацярыну**. Гэта ўжо другое дзіця ў сям'і, але матуля кажа, што шчасце не становіцца меншым:

— Лічу, вельмі добра, калі краіна ўмее рэагаваць не толькі на нейкія негатыўныя здарэнні, пасля якіх людзям патрэбна дапамога. Калі ўлада звяртае ўвагу і на нейкія дробныя радасці ў асобных сем'ях, дорыць падарункі — гэта здорава. Наогул імпануе сацыяльная скіраванасць акцый і дабрачынных праграм.

За пяць гадоў у сям'і **Анастасіі КАРЗЮК** нарадзілася трое дзяцей. Самы маленькі хлопчык хутка паедзе разам з мамай дадому да бацькі і дзвюх старэйшых сястрычак. Жанчына кажа, што ўсе тры разы нараджала ў цэнтры.

Анастасія КАРЗЮК з сынам Міхаілам.

— Мой Міша з'явіўся на свет ноччу ў першыя гадзіны Дня Незалежнасці, яшчэ да салютаў і парадаў. Насамрэч не важна, што адбываецца, калі ты ўпершыню трымаеш на руках сваё дзіця, бо гэты момант ты абавязкова запомніш назаўсёды.

Цэнтр «Маці і дзіця» арыентаваны на аказанне акушэрска-медыцынскай дапамогі жанчынам з усёй Беларусі, таму большасць мам — прыкладна 70 % — не мінчанкі. **Намеснік дырэктара па акушэрстве і гінекалогіі РНПЦ «Маці і дзіця» Святлана НАГІБОВІЧ** расказала, што ў Беларусі, як і ва ўсім свеце, змяняецца падыход да родаў:

— Камфортныя ўмовы ствараюцца не толькі ў Мінску, але і па ўсёй краіне, пачынаючы ад цэнтральных раённых бальніц і заканчваючы галаўной установай, дзе мы з вамі цяпер знаходзімся. Шчаслівае мацярынства — гэта тое, чым Беларусь вядомая сярод суседзяў. Сёння змяняюцца тэндэнцыі ў падыходзе да родаў, так, дзеці з самага пачатку застаюцца разам з маці, існуе магчымасць партнёрскіх родаў, у момант нараджэння дазваляецца прысутнічаць блізкім для цяжарнай жанчыны людзям — мужу, бацькам, сяброўцы. Мы стараемся паспрыяць маці, каб яна адчувала сябе ў поўнай бяспецы і пры гэтым не хвалявалася за дзіця. Цяпер акушэрства намнога адрозніваецца ад таго, што было раней. Сучасная рододапамога мае свае тэхналогіі, якія павінны зрабіць працэс па магчымасці зручным, звяртаецца ўвага на псіхалагічны камфорт.

Рагнеда ЮРГЕЛЬ.
Фота Сяргея НІКАНОВІЧА

ХТО НЕ РЫЗЫКУЕ, ТОЙ НЕ НАЧАЛЬНІК

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

На Захадзе кар'ерысткі прывыклі нараджаць ва ўзросце пад 40. І на гэта ёсць шэраг прычын. Калі ў вас дзеці, вы менш ідзяце на рызыкі, адмаўляецеся ад павышэння (бо гэта дадатковая нагрузка), не пагаджаецеся на пасады, звязаныя з пераездам.

Кіраўнік прадстаўніцтва Міжнароднай фінансавай карпарацыі ў Беларусі Вольга ШЧАРБІНА тлумачыць сітуацыю на сваім прыкладзе:

— У мяне ад 100 да 200 камандзіровачных дзён на год. Былі сітуацыі, калі калегі ляталі з немаўлятамі. У нашай арганізацыі вітаецца мультырэгіянальны вопыт, таму хочаш прасоўвацца па кар'ернай лесвіцы — будзь гатовы да пераездаў. Калі мужчына пераязджае з-за работы, да гэтага ставяцца з разуменнем. Маўляў, нічога, жонка будзе дома з дзецьмі сядзець. Адваротная сітуацыя, калі змяніць месца жыхарства трэба з-за павышэння жанчыны, успрымаецца зусім інакш.

Калі разглядаць сітуацыю ў нашай краіне, уплыў стэрэатыпаў відавочны. Згодна з вынікамі даследавання ЮНФПА, большасць беларусаў — 64 % мужчын і 54 % жанчын — бачаць здабытчыкам у сям'і менавіта мужчыну. Але пры гэтым лічаць, што сваю лепту ў агульны бюджэт павінны ўносіць абое. Толькі 23 % сем'яў дзеляць хатнія абавязкі. Прытым што важнасць дзяцей для самарэалізацыі прыкладна аднолькавая для жанчын і мужчын (гэты крытэрый адзначылі 73 і 68 працэнтаў апытаных).

На думку **Вольгі КУЗНЯЦОВАЙ, вядучага менеджара групы фінансавання і развіцця малога і сярэдняга прадпрымальніцтва Еўрапейскага банка рэканструкцыі і развіцця,** работадаўцы часам прад'яўляюць завышаныя патрабаванні да кандыдатак. «Мужчыну трэба адпавядаць крытэрыям вакансіі на 60 працэнтаў, каб атрымаць працу, а жанчыне — на 100. Нават больш», — лічыць яна.

Яшчэ адна цікавая заўвага прагучала на форуме: з мужчынамі прасцей працаваць, бо ў іх вектарнае мысленне. Яны думаюць, умоўна кажучы, як з пункта А трапіць у пункт Б. А спадарыні схільныя да эмацыянальных усплёскаў. Затое падыходзяць да справы больш скрупулёзна і педантычна. Дарэчы, для банкіраў жанчыны лічацца ўзорам вядзення бізнесу. Гэта датычыцца і дысцыпліны, і арганізацыі працы. Мяркуючы па статыстыцы аднаго з беларускіх банкаў, спадарыні больш адказныя пазычальнікі.

А вось стаць прадпрымальнікам жанчынам часта перашкаджае тое, што яны не вераць у сябе. Летась цэнтр эканамічных даследаванняў BEROC праводзіў апытанне фокус-групы. Аказалася, што сем з дзесяці прадстаўніц прыгожага полу, якія хочуць пачаць свой бізнес, так яго і не запускаюць. Сярод прычын на першым месцы — нявіпэўненасць ва ўласных сілах. Часта няма падтрымкі сярод сям'і і сяброў. Блізкія людзі могуць казаць: «Навошта табе гэты бізнес, сядзі дома». А такая прычына, як адсутнасць фінансаў, — адна з галоўных для жыхарак сельскай мясцовасці, але не для гараджанак.

Меншы ўзровень беспрацоўя сярод жанчын тлумачаць тым, што яны пагаджаюцца на нізкаплатную работу. Але тут ёсць і іншы бок: спадарыні, якім грамадства не навязвае ролю здабытчыка, больш вольныя ў выбары прафесіі. Калі мужчына арыентуецца на галіну дзейнасці, дзе будзе больш зарабляць, жанчына можа выбраць спецыяльнасць для душы.

Магчыма, многія перашкоды для кар'ернага росту — надуманыя? **Партнёр адвакацкага бюро Аляксандр ХРАПУЦКІ** прытрымліваецца такога пункту гледжання.

— Той, хто стараецца, усяго даб'ецца. Я не бачу праблемы. Акрамя таго, што я працую адвакатам, я яшчэ выкладаю ва ўніверсітэце. Звычайна тым, хто не з'яўляўся на парах, на экзамене стаўлю «двойку». І вось здавала іспыт дзяўчына. На занятках не была, казала, што сядзела з дзіцем. Адказвала выдатна. Я нават стаў прыглядацца, ці няма навушніка. Але дзяўчына насамрэч падрыхтавалася, усё вывучыла. Таму я лічу, што ўсё можна паспяваць.

Калі ў вас дзеці, вы менш ідзяце на рызыкі, адмаўляецеся ад павышэння, бо гэта дадатковая нагрузка, не пагаджаецеся на пасады, звязаныя з пераездам.

— Мне здаецца, жанчынам варта самім вызначыцца, ці хочуць яны станавіцца лідарамі, — дзеліцца **прадстаўнік ЮНІСЭФ у Беларусі Рашэд Мустафа САРВАР.** — Бо калі ідзе абмеркаванне павышэння пенсійнага ўзросту, напрыклад, да мужчынскай планкі ці скарачэння дэкрэтнага водпуску, яны самі выказваюцца супраць.

Бізнесвумен пагаджаюцца: сёння сумяшчаць працоўныя і хатнія абавязкі значна прасцей. Частку абавязкаў ты можаш перакласці на плечы клінінгавых кампаній, прыватных садкоў. Плюс знайсці дыстанцыйную работу ці з гнуткім графікам.

А вось тое, што жанчыны часам выбіраюць загадзя пройгрышную лінію паводзін, — можа стаць перашкодай. Ёсць дзве крайнасці: пазіцыя «я дзяўчына, таму стаўцеся да мяне інакш» і адчайная спроба стаць «сваім» — хадзіць з калегамі-мужчынамі ў лазню, піць алкаголь нароўні. Што рабіць? Заставацца сабой і быць прафесіяналам.

Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.

Андрэй ЖАЙЛОВІЧ:

«ПОСПЕХ ЗАБЯСПЕЧВАЕ КАМАНДА ПРАФЕСІЯНАЛАЎ»

Ці ведаеце, дзе ў Беларусі з'явілася першая «студэнцкая вёска», першая трохузроўневая развязка, а таксама праведзена першая аперацыя па перасадцы комплексу «сэрца-лёгкія»? Не? Дык мы вам зараз раскажам. Дзеля гэтага напрасіліся ў госці да кіраўніка адміністрацыі Маскоўскага раёна горада Мінска Андрэя Жайловіча і даведаліся аб шмат чым цікавым.

Колькасць жыхароў тройчы ўзрасла

— Маскоўскі раён Мінска — адзін з самых маладых і тых, што дынамічна развіваюцца ў беларускай сталіцы, — распачаў гутарку з невялічкага экскурсу ў гісторыю мой суразмоўнік. — Атрымаўшы афіцыйны статус самастойнай адміністрацыйнай адзінкі ў красавіку 1977 года, ён увабраў у сябе землі, якія маюць шматвекавую гісторыю. Сёння яна знайшла адлюстраванне ў назвах новых мікрараёнаў — Малінаўка, Брылевічы, Міхалова, Грушаўка. Раён размешчаны ў паўднёва-заходняй часцы Мінска і займае амаль 2,9 тысячы гектараў, раскінуўшыся ад плошчы Незалежнасці да мінскай кальцавой аўтадарогі ў брэсцкім кірунку. Такое геаграфічнае становішча ўмоўна падзяляе раён на дзве часткі: адна знаходзіцца ў цэнтры горада і ўвабрала ў сябе мноства аб'ектаў культуры, адукацыі, гандлю, другую ж можна смела аднесці да спальнай часткі: гэта мікрараёны жылой забудовы і спадарожных ёй аб'ектаў сацыяльнай інфраструктуры.

— За 40 гадоў самастойнага існавання раёна як змянілася колькасць яго жыхароў?

— Вядома, колькасць жыхароў выраслa: з пачатку заснавання больш чым у тры разы. Сёння ў раёне жыве звыш 300 тысяч чалавек.

— Андрэй Леанідавіч, ці можна назваць асаблівым гонарам Маскоўскага раёна сталіцы праспект Дзяржынскага, які стаў не толькі цэнтральнай транспартнай артэрыяй, але і прыкладам гармоніі гарадской архітэктуры?

— Безумоўна, што так. Забудова праспекта, названага ў гонар нашага вядомага земляка, пачыналася з 1977 года ў напрамку былой вуліцы Савецкіх пагранічнікаў. Яшчэ нядаўна ён не меў якаснай сістэмы, не спраўляўся з транспартнымі патокамі. З 2010-га па 2014 год у выніку рэканструкцыі праспект Дзяржынскага стаў візітнай карткай раёна, ператварыўшыся ў цэнтральную транспартную магістраль, упрыгожанную аб'ектамі розных архітэктурных формаў і стыляў. На перакрыжаванні з праспектам Жукава з'явілася першая ў Беларусі трохузроўневая развязка-эстакада. Падарункам для жыхароў разам з рэканструкцыяй праспекта сталі і размешчаныя на ім чатыры новыя станцыі метро: «Грушаўка», «Міхалова», «Пятроўшчына» і «Малінаўка».

— Ведаю, што адным з ключавых аб'ектаў будаўніцтва стаў жылы комплекс «Студэнцкая вёска», у чым яго адметнасць?

— У тым, што аналагаў яму ў краіне няма. Ён размясціўся амаль на 40 гектарах і налічвае сем студэнцкіх інтэрнатаў кватэрнага тыпу, у якіх жывуць каля сямі тысяч студэнтаў вядучых ВНУ краіны, з іх тысяча — навучэнцы з-за мяжы. Студэнцкая вёска мае развітую інфраструктуру — бібліятэкі, кафэ, цырульню, крамы, пральні, памяшканні для заняткаў фізічнай культурай і творчасцю, кабінеты медыцынскага абслугоўвання. На яе тэрыторыі размешчаны нават Лядовы палац. Зараз вядуцца будаўніча-мантажныя работы на апошнім, восьмым, інтэрнаце, здаць у эксплуатацыю які запланавалі налета, пасля чаго комплекс атрымае сваё поўнае архітэктурна-будаўнічае афармленне. З 21 па 30 чэрвеня 2019 года жылы комплекс са «студэнцкай» пераўтворыцца ў вёску спартыўную. Тут будуць размешчаны ўдзельнікі II Еўрапейскіх гульняў — міжнародных спартыўных спаборніцтваў, якія праводзяцца раз на чатыры гады пад кіраўніцтвам Еўрапейскіх алімпійскіх камітэтаў.

— Ці прывабліве такое актыўнае будаўніцтва буйны гандаль у раёне?

— У сувязі з тым, што колькасць жыхлля тут значна ўзрасла, раён стаў цікавай пляцоўкай для развіцця гандлёвага бізнесу. Некалькі лічбаў: на 187,8 тысячы квадратных метраў функцыяне 2009 рознічных аб'ектаў гандлю, у тым ліку 1073 крамы. Дарэчы, 166 фірменных крам сёння прапануюць разам з замежнымі брэндамі тавары такіх айчынных вытворцаў, як «Элема», «Беліта», «Галантэя», «Сівельга» ды іншыя. У раёне працуюць 11 гандлёвых цэнтраў з плошчай 105,2 тысячы м², тры рынкі, налічваецца 568 аб'ектаў грамадскага харчавання і звыш 750 аб'ектаў бытавых паслуг. Тут камфортна жыць не толькі гараджанам, але і тым, хто прыязджае да нас у госці: на тэрыторыі раёна ёсць шэсць гатэляў ад дзвюх да чатырох зорак. Агульны нумарны фонд складае 752 адзінкі, у тым ліку 41 класа люкс.

Сацыяльны вектар

— Галоўным багаццем раёна лічыце...

— ...людзей. Безумоўна, гэта яго жыхары, работнікі прадпрыемстваў, навучэнцы школ, гімназій, ліцэяў, калеждаў і ВНУ, ветераны вайны і працы.

Дарэчы, сацыяльная абарона, работа з сацыяльна неабароненымі катэгорыямі грамадзян была і застаецца прыярытэтнай у дзейнасці раённай адміністрацыі. Для маладых людзей з цяжкай формай інваліднасці на базе тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва працуе аддзяленне дзённага знаходжання, якое мае сучаснае рэабілітацыйнае абсталяванне. Для састарэлых і актыўных жыхароў раёна працуюць шматпрофільныя клубы і гурткі з шырокім спектрам інтарэсаў і відаў дзейнасці, групы самадапамогі.

— Вы крыху закранулі медыцынскі аспект, ці можна аб ім больш падрабязна? Ведаю, што некаторыя аперацыі ўпершыню выконваліся ў Маскоўскім раёне.

— Так, наш раён унікальны ў частцы аказання медыцынскай дапамогі. У 2015 годзе тут праведзена аперацыя па «ўкараненні» ствалавых клетак у пашкоджаную зону сэрца пацыентам з сардэчнай недастатковасцю. Упершыню ў Беларусі ў 2016 годзе праведзена аперацыя па перасадцы комплексу «сэрца-лёгкія». Гэтыя і іншыя высокатэхналагічныя ўмяшанні выконваліся на базе РНПЦ «Кардыялогія». Акрамя гэтага, на тэрыторыі раёна ў РНПЦ отарыналарынгалогіі ўпершыню ў краіне і СНД укаранёна новая тэхналогія — эндаскапічная энданазальная тубадылятацыя. Тут жа ўкаранілі і лічбавае слыхапратэзаванне дзяцей да года, імплантацыю сістэмы коснай праводнасці пры прыроджаных пароках вонкавага і сярэдняга вуха. Першая ў гісторыі беларускай медыцыны аперацыя па перасадцы печані таксама прайшла на тэрыторыі Маскоўскага раёна. Яе правялі ў красавіку 2008 года ў РНПЦ трансплантацыі органаў.

Геаграфія гандлю — увесь свет

— Хацелася б крыху закрануць і эканамічны блок: што сёння складае прамысловы патэнцыял раёна?

— Прадпрыемствы фармацэўтычнай, радыёэлектроннай, паліграфічнай, абутковай і іншых галін. Флагманамі з'яўляюцца РУП «Белмедпрэпараты», РУП «Завод электронікі і бытавой тэхнікі «Гарызонт», ЗАО «Вітэкс», СП «Беліта» ТАА, ААТ «Мінскі вагонарамонтны завод», на долю якіх прыпадае 60 % прамысловай прадукцыі, якая выпускаецца ў раёне. Між іншым, у нашым раёне актыўна развіваецца сектар інавацыйнай эканомікі, ствараюцца арганізацыі ІТ-сферы, сацыяльнага кірунку, развіваецца гандлёвая дзейнасць, а таксама грамадскае харчаванне. Дарэчы, на тэрыторыі раёна дзейнічаюць амаль 18,5 тысячы суб'ектаў гаспадарання, з іх 27 буйных прамысловых прадпрыемстваў, больш за 10 тысяч індывідуальных прадпрымальнікаў.

Прадукцыю, што вырабляецца ў Маскоўскім раёне сталіцы, ведаюць і карыстаюцца ёю не толькі ў краінах СНД, але і ў Германіі, Кітаі, Аўстраліі, ЗША. У апошнія гады пералік краін-імпарцёраў пашырыўся за кошт В'етнама, Ірака, Ганконга, Пакістана, Англіі, Тайланда і Сірыі. Самымі буйнымі экспарцёрамі ў раёне з'яўляюцца такія прадпрыемствы, як «Гарызонт», «Вітэкс» і «Беліта».

На тэрыторыі раёна знаходзіцца першы ў Беларусі вытворца цэлага шэрагу сучасных высокаэфектыўных супрацьпухлінных лекавых сродкаў — «Белмедпрэпараты».

Раёны, кварталы, жылыя масівы...

— Разам з прамысловасцю ў раёне атрымала развіццё і будаўнічая галіна. Якая задача сёння стаіць перад ёю?

— Павышэнне якасці будаўніцтва і зніжэнне яго сабекошту. У мэтах паляпшэння жыллёвых умоў насельніцтва, забеспячэння даступнасці жылля прадугледжваецца далейшае развіццё рынку арэндnага жылля за кошт арганізацый і прыватных інвестараў. У цэнтральнай частцы раёна прыватны сектар уздоўж праспекта Дзяржынскага паступова саступае месца шматлікім аб'ектам адміністрацыйнага і грамадскага прызначэння, новым жылым кварталам і мікрараёнам, якія ўпрыгожваюць праспект пачынаючы з 2010 года. У 2006-м было распачата засваенне мікрараёна Брылевічы, а ўжо ў 2007-м там былі здадзены першыя жылыя дамы. Сёння гэта адзін з добраўпарадкаваных куткоў раёна, дзе ёсць тры дзіцячыя садкі, дзве сярэднія школы, дарослая і дзіцячая паліклінікі, басейн. Актыўна працягваецца засваенне жылога мікрараёна Міхалова.

Дарэчы, летась у раёне пабудавана 130,9 тыс. кв. м жылля. У сёлетніх планах — 206,5 тыс. кв. м.

— Такое актыўнае жыллёвае будаўніцтва патрабуе і развіцця сацыяльнай інфраструктуры. Як вырашаецца гэтае пытанне ў раёне?

— Напрыклад, летась была здадзена ў эксплуатацыю 6-я гарадская дзіцячая паліклініка і басейн «Дружба» ў мікрараёне Брылевічы. Адкрылася аддзяленне дзённага знаходжання для інвалідаў «ТЦСАН Маскоўскага раёна г. Мінска» па вуліцы Ясеніна. Сёлета завяршылася будаўніцтва трапеўтычнага корпуса на 330 месцаў у 4-й гарадской клінічнай бальніцы імя Саўчанкі.

У межах інвестыцыйнай праграмы сталіцы на 2018 год на тэрыторыі раёна запланавана праектаванне і будаўніцтва шэрагу сацыяльных аб'ектаў. Актуальным застаецца пытанне будаўніцтва новай шматпрофільнай паліклінікі для дарослага насельніцтва на 850 наведванняў за змену замест існуючай 15-й гарадской паліклінікі па вуліцы Розы Люксембург, якая функцыянуе з 1962 года. Акрамя асноўнага будынка, паліклініка размешчана ў двух філіялах і жылых дамах. Яна абслугоўвае 42,5 тысячы чалавек. Улічваючы актыўную забудову жыллём, колькасць жыхароў у раёне няспынна расце. Менавіта гэтым і тлумачыцца неабходнасць будаўніцтва новай паліклінікі большай магутнасці. Ужо выдзеленыя сродкі на карэкціроўку гэтага праекта.

— А калі плануеце пачаць будаўніцтва?

— Улічваючы праектныя работы, будаўніцтва шматпрофільнай паліклінікі ў кварталe вуліц К. Лібкнехта — Хмялеўскага — Р. Люксембург — Лермантава плануем распачаць сёлета. А ўвесці ў эксплуатацыю запланавалі ў 2021 годзе.

— Наколькі мне вядома, ёсць і іншыя сацыяльныя аб'екты, якія будуюцца ў Маскоўскім раёне...

— Так, завяршаецца будаўніцтва сярэдняй агульнаадукацыйнай школы на 1020 месцаў у мікрараёне Дружба-1, а таксама сёлета завершыцца будаўніцтва дзіцячых ясляў-садка на 230 месцаў.

Вядуцца праектныя работы па будаўніцтве яшчэ адной школы і дзіцячых ясляў-садка ў межах праспектаў Дзяржынскага — Любімава і вуліцы Сямашкі.

Акрамя таго, рэканструкцыя забудовы тэрыторыі ў раёне вуліц Міхалова, Алібегава прадугледжвае будаўніцтва дзіцячага садка на 190 месцаў, зараз вядуцца праектныя работы. Распачаты таксама праектныя работы па будаўніцтве дзіцячага садка на 220 месцаў у межах праспектаў Дзяржынскага — Шчорса — вуліцы Чыгуначнікаў — завулкаў Разінскага — 1-га Вазніцкага.

Вядуцца праектныя работы па рэканструкцыі былой школы № 39 пад цэнтр творчасці дзяцей і моладзі «Ранак» па праспекце газеты «Правда», працягваецца рэканструкцыя галоўнага корпуса з прыбудовай кардыяхірургічнага аперблока і блока трансплантацыі ствалавых клетак 9-й гарадской клінічнай бальніцы па вуліцы Сямашкі.

— Слухаю вас і здзіўляюся, як усе гэтыя планы атрымліваецца спалучаць і рэалізоўваць?

— Ведаеце, сакрэт поспеху — выключна ў камандnай гульні сапраўдных прафесіяналаў. Нам пашчасціла — папярэдні склад кіраўніцтва, як і дзеючы, добра разумее гэту сентэнцыю, таму і вынік адпаведны.

Гутарыла Вольга АНУФРЫЕВА.

■ Шчырыя сэрцы

МЕСЦА, ДЗЕ ЗАЎСЁДЫ ЗРАЗУМЕЮЦЬ І ПАДТРЫМАЮЦЬ...

Якую ўнікальную дапамогу можна атрымаць у цэнтры сацыяльнага абслугоўвання

Васямнаццаць гадоў таму, адразу пасля адкрыцця, дзяржаўная ўстанова «Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска» складалася ўсяго з аднаго аддзялення, якое каардынавала дзейнасць сацыяльных работнікаў дома. Зараз жа цэнтр аказвае найшырэйшы спектр паслуг і істотна падтрымлівае ўсе тыя катэгорыі грамадзян, якім патрэбна асаблівая ўвага. Толькі за першы квартал 2018 года тэрытарыяльны цэнтр аказаў больш за 40 тысяч паслуг.

Так, як адзначыла **дырэктар цэнтра Інеса ЖЫБУЛЬ,** з верасня мінулага года на базе цэнтра дзейнічае паслуга дзённага знаходжання маладых людзей з цяжкімі і множнымі парушэннямі. Нова-ўвядзенне вырашае адразу дзве глабальныя задачы. Па-першае, у маладых людзей, якім цяжка самастойна перасоўвацца і абслугоўваць сябе, з'явілася магчымасць выйсці з замкнёнай прасторы дома або кватэры, паглыбіцца ў сацыум і атрымліваць комплекс сацыяльна-рэабілітацыйных паслуг. Па-другое, іх бацькі, якія раней былі прывязаныя да дзяцей не толькі эмацыянальна, але і фізічна, зараз могуць уладкавацца на працу ў дзённы час. Тым больш, відавочна, што такі фармат баўлення часу ідзе маладым людзям толькі на карысць — памяшканне, дзе яны знаходзяцца, аснашчана самым сучасным рэабілітацыйным абсталяваннем. З падапечнымі цэнтра працуюць не толькі спецыялісты па сацыяльнай рабоце, але і дэфектолагі, псіхолагі, эргатэрапеўты, якія дапамагаюць маладым людзям сацыялізавацца і паступова развіваць іх лепшыя здольнасці.

— Наконт гэтага ў нас ёсць вельмі натхняльны прыклад. У групу дзённага знаходжання трапіла дзяўчына, якая перасоўвалася толькі ў спецыяльных тэхнічных сродках са старонняй дапамогай. Але, бачачы вялікі патэнцыял, спецыялісты падчас заняткаў навучылі яе хадзіць самастойна. Цяпер дзяўчына можа не толькі перасоўвацца сама, але і дапамагаць іншым, — расказвае **намеснік дырэктара цэнтра Таісія ЗЕНАВА.**

Зараз аддзяленне наведвае васямнаццаць чалавек узростам ад 16 да 40 гадоў, у найбліжэйшы час група павінна папоўніцца яшчэ пяццю новымі наведвальнікамі.

Вялікую ўвагу супрацоўнікі цэнтра ўдзяляюць тэме процідзеяння хатняму гвалту. Дзейнічае мабільная гарачая лінія для пацярпелых, таксама сацыяльныя работнікі, якія часта бываюць у сем'ях, праходзяць спецыяльнае навучанне ў дасведчаных кваліфікаваных трэнераў на тэмы таго, як распазнаць хатні гвалт, як мець зносіны з пацярпелымі і куды іх накіроўваць па дадатковую дапамогу. Трохі памяняўся і ракурс успрымання праблемы. Усё часцей гаворыцца пра тое, што гвалт можа быць не толькі фізічным, але і псіхалагічным ці эканамічным, калі цалкам пазбаўляюць грашовых сродкаў або нават выганяюць з дому. Акрамя таго, значныя намаганні прыкладаюцца, каб прадухіляць хатні гвалт у дачыненні да пажылых людзей.

Аддзяленне дзённага знаходжання.

Студыя «Палітра».

Дарэчы, на базе цэнтра запушчаны сумесны праект з Беларускім інстытутам правазнаўства «Юрыдычная клініка». Тыя, хто мае патрэбу, могуць атрымліваць бясплатна дапамогу выкладчыкаў і студэнтаў старшых курсаў, прычым не проста кансультацыйную, а паўнавартасныя паслугі адваката. Прыёмы прыходзяць два разы на тыдзень. Супрацоўнічае тэрытарыяльны цэнтр і з БДПУ імя М. Танка: тут адкрыты філіял кафедры сацыяльнай работы. Апроч таго, што студэнты атрымліваюць практычны вопыт, яны яшчэ і праводзяць каштоўную даследчую працу: супрацоўнікі цэнтра могуць прапаноўваць ім найбольш актуальныя тэмы для курсавых і дыпломных работ.

Добра вядомы па ўсёй Беларусі і нават за мяжой Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Маскоўскага раёна г. Мінска дзякуючы такім праектам, як студыя «Палітра», дзе людзі з ментальнай інваліднасцю займаюцца мастацкай творчасцю, тэатр «Сонечныя дзеці», у якім займаюцца маладыя людзі з сіндромам Даўна. Вялікай папулярнасцю карыстаецца і «Лятучы клуб мам», арганізаваны па прыкладзе партнёраў з Польшчы. Гэта прастора, дзе сустракаюцца мамы, якія знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе дзіцяці, альбо мамы, якія выхоўваюць дзяцей з інваліднасцю. Яны ўдзельнічаюць у майстар-класах па жаночым лідарстве, прадпрымальніцтве, хэнд-мэйдзе ды і проста гутараць аб сваіх надзённых перажываннях, каб не замыкацца ў сабе і адчуваць падтрымку блізкіх па духу людзей ■

■ Моц ведаў

Як юныя інтэлектуалы ўпадабалі царыцу навук

Сталічная гімназія № 41: крэда — перамагаць

Толькі ўвайшоўшы ў ДУА «Гімназія № 41 г. Мінска імя В. Х. Сярэбранага», адчуваеш асаблівую атмасферу. Гэтаму спрыяе і прыгожы будынак у класічным стылі, і інфармацыя аб дасягненнях вучняў на міжнародных конкурсах па ўсім свеце — адпаведны стэнд сустракае гімназістаў і гасцей, а таксама выстаўкі незвычайных карцін і малюнкаў, якія можна ўбачыць у калідорах. У гэтай навучальнай установе добра ведаюць, як паспяхова сумясціць у навучанні дакладныя навукі і творчасць.

І ўсё ж у першую чаргу ўстанова славіцца сваім асаблівым падыходам да вывучэння матэматыкі. Як расказала **дырэктар гімназіі Марыяна СКАКУН,** традыцыю заклаў адораны настаўнік Валянцін Хаімавіч Сярэбраны, які натхніў мноства хлопцаў і дзяўчат палюбіць адзін з самых складаных прадметаў школьнай праграмы. Як вынік — шматлікія перамогі на гарадскіх, рэспубліканскіх і міжнародных этапах алімпіяд, а таксама шчырае жаданне маладых людзей звязаць сваё жыццё з гэтай навукай. Зараз у гімназіі працуюць вучні і паслядоўнікі Валянціна Сярэбранага, а сама ўстанова адукацыі носіць яго імя. Нестандартны падыход да вывучэння матэматыкі актыўна выкарыстоўваецца тут і зараз: так, ужо з сёмага класа гэты прадмет або факультатывы па ім вядуць выкладчыкі БДУ. Таксама прымяняецца методыка «роўны навучае роўнага», калі старшакласнікі або нават выпускнікі, якія паступілі ў вышэйшыя навучальныя ўстановы па гэтым профілі, дзеляцца сваімі ведамі з малодшымі вучнямі. Усе намаганні не праходзіць дарма, доказ таму — 14 дыпломаў, атрыманых гімназістамі сёлета на рэспубліканскім этапе алімпіяды. Вядома, сярод лідараў — матэматыка, але таксама добра праявілі сябе вучні ў хіміі і біялогіі. Гэта найлепшы вынік па ўсіх школах і гімназіях у краіне, улічваючы, што гімназія № 41 г. Мінска зусім невялікая: у ёй няма пачатковай школы і вучыцца ўсяго 400 чалавек.

Што да ўдзелу ў маштабных міжнародных конкурсах, то толькі за мінулы навучальны год адораныя падлеткі заваявалі прызавыя месцы на шасці з іх.

Не забываюць у гімназіі і аб развіцці творчых здольнасцяў асобы. Так, па словах **намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце Наталлі ГАЙДУК,** у вучняў ёсць магчымасць наведваць грунтоўныя факультатывы па мастацтве, у праграме — малюнак, кампазіцыя, жывапіс і іншыя кірункі. З дзецьмі займаюцца прафесійныя мастакі. Тэматычныя вернісажы на прасторах гімназіі з працамі юных творцаў пастаянна змяняюць адзін аднаго, удзельнічаюць хлопцы і дзяўчаты і ў больш сур'ёзных выстаўках, нярэдка прывозяць дыпломы з конкурсаў. Нагогул, для тых, хто марыць змяніць аблічча любімага горада, стаўшы запатрабаваным архітэктарам, больш удалае месца вучобы ўявіць цяжка. Не дзіўна, што шмат выпускнікоў выбіраюць сабе менавіта гэтую прафесію ў якасці жыццёвага шляху.

Ёсць у дзейнасці гімназіі і яшчэ адзін важны напрамак — ушанаванне гістарычнай і нацыянальнай спадчыны. На базе ўстановы адукацыі дзейнічае музей этнакультуры Беларусі «Святавіт», экспанаты для якога разам збіралі вучні і педагогі. Было праведзена нават некалькі этнаграфічных экспедыцый. Зараз у фондзе музея больш за 200 каштоўных экспанатаў ■

Матэрыялы падрыхтавала Дар'я КАСКО.

ІНТЭРАКТЫЎНАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ,

або Як прадукцыя «Гарызонта» змяняе свет

Сёння цяжка назваць галіну, якая абыходзілася б без сучасных тэхналогій. Яны ўжо не толькі дапамагаюць ствараць і спажываць кантэнт, але і ўплываюць на наш лад жыцця. Дзякуючы тэхнічным навінкам можна мяняць адукацыйны працэс, па-іншаму дзяліцца сваімі ведамі і думкамі, рабіць прэзентацыі больш насычанымі, яскравымі. Сучасныя тэхналогіі ўздзейнічаюць і на нашы ўражанні. Інфармацыя на вялікіх экранах дапамагае правільна расставіць акцэнты падчас бізнес-сустрэчы, прыцягнуць увагу кліента да сваёй кампаніі ці прадукцыі ў гандлёвым цэнтры, скіраваць патокі людзей на сацыяльных аб'ектах, знойдзецца прымяненне ім і ў індустрыі забаў. І, бясспрэчна, сучасныя тэхналогіі робяць наш побыт больш зручным, камфортным. І адно з найбуйнейшых у Рэспубліцы Беларусь прадпрыемстваў, якое стварае такія разумныя рэчы, што мяняюць свет вакол нас, — вытворчае ўнітарнае прадпрыемства «Завод электронікі і бытавой тэхнікі «Гарызонт».

ВІТАЕМ У БУДУЧЫНІ

Сёння мы не будзем паглыбляцца ў гісторыю прадпрыемства і разбірацца з эвалюцыяй «блакітнага экрана». Адзначым толькі, што «Гарызонт» — адзін з найбуйнейшых вытворцаў электроннай тэхнікі на тэрыторыі СНД, прадукцыя якога карыстаецца попытам ужо больш за 70 гадоў. Нарошчванне аб'ёмаў вытворчасці і продажаў на ўнутраным і знешнім рынках ці не лепшае сведчанне таму, што брэнду давяраюць. На міжнародных выстаўках, дзе беларускія прадпрыемствы прэзентуюць сваю прадукцыю, менавіта стэнды «Гарызонта» — адны з самых папулярных.

Прадпрыемству сапраўды ёсць чым уразіць кліентаў. На змену маленькім «пузаценькім» тэлевізарам прыйшла зусім іншая тэхніка, якую можна падстройваць пад свае патрэбы.

Каб ствараць тэлевізійную тэхніку, якая будзе адпавядаць сучасным патрабаванням рынку і па тэхналагічных характарыстыках, і па спажывецкіх якасцях, прадпрыемства мадэрнізуецца. Так, на «Гарызонце» наладжана вытворчасць LCD-панэляў, на заводзе створаны так званы чысты пакой — складанае тэхнічнае збудаванне, у якім рэгулюецца канцэнтрацыя завісных у паветры часцінак пылу і падтрымліваецца спецыфічны мікраклімат. Падобных вытворчасцяў на тэрыторыі СНД — адзінкі! Дарэчы, завод шчыльна працуе з сусветнымі вытворцамі, заключаны дагаворы з брэндатрымальнікамі, па заказе якіх у Беларусі вырабляюцца тэлевізары каля дзевяці брэндаў. Напрыклад, на вытворчых пляцоўках завода «Гарызонт» сёння збіраюцца тэлевізары такіх гандлёвых марак, як Panasonic, Sharp, Daewoo.

У апошні час назіраецца рост цікавасці да мадэляў з большым экранам. І сёння прадпрыемства выпускае лінейку LCD-тэлевізараў з дыяганалямі ад 15 да 70 цаляў, з шырокім наборам тэхнічных і спажывецкіх функцый.

Усё большую папулярнасць набываюць тэлевізары Horizont з функцыяй Smart TV (камп'ютарнай сістэмай, якая інтэгруецца ў тэлевізар і робіць магчымым усталяванне дадатковых праграм і паслуг). Для карыстальнікаў, якіх не задавальняе традыцыйнае эфірнае тэлебачанне, гэта добрая магчымасць падбору кантэнту пад свае патрэбы, тыя ж фільмы і анімацыю можна загружаць з інтэрнэту.

Так паступова тэлевізар ператвараецца ў камп'ютар, ён «надзелены» тымі ж магчымасцямі. Дзякуючы функцыі miracast можна аб'ядноўваць тэлевізар са смартфонам. Тэлефон выкарыстоўваецца як пульт і інфармацыю з яго зручна пераносіць на вялікі экран.

Попыт на тэлевізары з функцыяй Smart пастаянна расце, але «Гарызонт» працягвае вырабляць і іншыя мадэлі — усё ж некаторым спажыўцам, асабліва пражываючым старэйшага пакалення, трэба прызвычаіцца да разумнай тэхнікі. Але самыя прасунутыя пенсіянеры, якія абнавілі свае тэлевізары, ужо паспелі адзначыць, якія выгоды дае функцыянал. З вялікага экрана можна не толькі глядзець любімыя перадачы ў зручны для сябе час, але і сачыць за жыццём сваіх родных: знаёміцца з фатаграфіямі, прывезенымі на флэшках з падарожжаў, вяселляў. Між іншым, усе сучасныя тэлевізары ідуць з USB-раздымам.

Асартымент прадукцыі, якую выпускае ЗЭБТ «Гарызонт», пастаянна папаўняецца сучаснымі мадэлямі, у тым ліку дзякуючы ўкараненню перадавых тэхналогій і распрацовак, звязаных з дасягненнямі як айчынных, так і замежных вытворцаў. Так, сёлета ў верасні ў продаж павінны паступіць мадэлі тэлевізараў высокай раздзяляльнасці Ultrahd 4K (сёння падобная прадукцыя толькі пачынае завоёўваць прыхільнікаў на сусветным тэлевізійным рынку). Між іншым, узровень тэхналогій унітарнага прадпрыемства ўжо зараз дазваляе вырабляць тэлевізары і з раздзяляльнасцю ў 8К. Такая навінка ад брэнда Horizont была прадстаўлена на міжнароднай выстаўцы ў Душанбэ (Таджыкістан) і ў Мінску ў рамках правядзення Беларускага прамысловага форуму і на выстаўцы ТІБО.

Яскравая і максімальна дакладная перадача колераў — бясспрэчная перавага 4К-тэлевізараў. Але трэба сказаць, што, набываючы падобны тавар, вы робіце інвестыцыі ў будучыню. Калі ваш тэлевізар сёння не дае сакавітую карцінку, гэта не азначае, што ён дрэнны. Справа ў тым, што вытворцы тых жа фільмаў і перадач не паспяваюць за хуткасцю развіцця тэлевізійнай тэхнікі, і інфармацыйных прадуктаў у 4К пакуль мала. Але аб'ём кантэнту (у тым ліку і прадукцыі кінаіндустрыі) адпаведнай якасці будзе расці, і ўладальнікі новых тэлевізараў аднымі з першых змогуць атрымаць асалоду ад яго прагляду.

І канешне, сучасныя тэлевізары становяцца лёгкімі і тонкімі (у перспектыве выпуск ультратонкіх). Для спажыўцоў ствараюцца мадэлі на пластыкавых ці металічных ножках, тэлевізары можна размяшчаць і на сцяне як карціну. Між іншым, аматарам мастацтва варта звярнуць увагу на такую распрацоўку прадпрыемства, як сэнсарная сістэма «Мальберт». Гэта не толькі прыгожы элемент інтэр'ера, на якім зручна загружаць разнастайныя творы мастакоў, але і інструмент для творчасці: малюнак на экране можна змяніць, падправіць, дамаляваць новыя дэталі. Таксама добра загружаць фатаграфіі, запускаць слайд-шоу, і разумная тэхніка на працягу пэўнага перыяду будзе паказваць, напрыклад, як за год выраслa вашае дзіця.

НОВЫЯ МАГЧЫМАСЦІ

Зразумела, новы функцыянал, якім абзавялася сучасная тэхніка, дазваляе пашырыць сферы яе выкарыстання. Адукацыя, бізнес, медыцынскія аб'екты, гандаль... Ужо сёння цяжка будзе ператлічыць прадпрыемствы і ўстановы, у якіх задзейнічаны распрацоўкі «Гарызонта», і гэта пры тым, што грамадства толькі пачынае знаёміцца з выгодамі ад выкарыстання новых тэхналогій.

Напрыклад, інтэрактыўныя сэнсарныя сістэмы — ідэальны адукацыйны інструмент для школ, ВНУ і іншых навучальных устаноў. Найноўшае праграмнае забеспячэнне дазваляе дэманстраваць электронныя энцыклапедыі, навучальныя праграмы, відэа- і аўдыяматэрыялы, адкрываць доступ да электронных рэсурсаў навучальнай установы, наладжваць камунікацыю паміж выкладчыкамі і студэнтамі. А сэнсарны інтэрфейс дазваляе працаваць з інфармацыяй: выдзяляць, маштабаваць, змяняць, рабіць нататкі, малюнкі, выкарыстоўваючы стылус ці проста рукі. Са спецыяльным праграмным забеспячэннем сістэмы могуць выкарыстоўвацца і як інфастэнды, дзе студэнты праглядаюць расклад заняткаў, запісваюцца на семінары, удзельнічаюць у апытаннях і галасаваннях.

Прыемны бонус: сэнсарныя панэлі не абавязкова сёння размяшчаць у кожнай аўдыторыі. Існуюць мадэлі, якія зручна перамяшчаць — са спецыяльнай падстаўкай на колах.

Інтэрактыўныя сэнсарныя сістэмы пачалі заказваць школы. У класах, аснашчаных такім абсталяваннем, можна не толькі праводзіць разнастайныя заняткі для дзяцей, але і сачыць за паспяховасцю вучняў. Сістэмны блок інтэрактыўнай сістэмы H-Board працуе на базе ліцэнзійнай аперацыйнай сістэмы Windows 10, зразумелай і простай у выкарыстанні як для настаўнікаў, так і для вучняў.

Нават самыя юныя жыхары Беларусі ўжо паспелі пазнаёміцца з інтэрактыўнай сэнсарнай сістэмай H-Board. Такі інтэрфейс дазваляе арганізаваць з малымі развіваючыя заняткі, напрыклад, дапамагаць ім засвойваць арыфметыку і замежныя мовы, развіваць логіку і памяць. А яшчэ на панэлі, між іншым зробленай з ударатрывалага і загартаванага шкла, можна маляваць і гуляць у розныя гульні. Інтэрактыўная сістэма падтрымлівае да шасці дотыкаў, што, бясспрэчна, ацэняць педагогі, якія імкнуцца падчас калектыўных заняткаў даць магчымасць праявіць сябе кожнаму дзіцяці.

На прадпрыемстве створаны чысты пакой для вытворчасці LCD-панэляў.

Сучасная тэхніка — надзейны і зручны памочнік у час правядзення канферэнцый, прэзентацый, нарад і пасяджэнняў. Навукоўцы, бізнесмены, дэпутаты атрымалі электронныя трыбуны, якія дапамагаюць прэзентаваць тэксты, фатаграфіі, графікі і іншае, а таксама наладжваць зваротную сувязь з аўдыторыяй. Такая інтэрактыўная сістэма нават пакажа спіс усіх прысутных і месца, імя і пасаду асобы, якая з залы задае пытанне дакладчыку. Прадугледжана і інтэграцыя з дэвайсамі аўдыторыі і фарміраванне адзінай сістэмы інтэрактыўнай прасторы.

Таксама трыбуна можа выкарыстоўвацца ў медыцынскіх установах: дапамагаць пры праверцы вынікаў абследаванняў, служыць даведнікам па леках, каталогам наяўных паслуг (з іх апісаннем), электроннай рэгістратурай і нават даваць адказы на найбольш частыя пытанні грамадзян.

Сэнсарныя сістэмы, якія выпускае «Гарызонт», вы можаце сустрэць у музеях, на вакзале і нават на вуліцы. Яны забяспечваюць неабходнай інфармацыяй, палягчаюць навігацыю па горадзе, змяшчаюць карты, знаёмяць з раскладам руху транспарту, падказваюць, якія мясціны і ўстановы можна наведаць, дапамогуць выклікаць таксі ці экстранныя службы, забраніраваць месца ў гасцініцы ці заказаць экскурсіі і білеты.

Выкананне (форма, памер, колер, дызайн, начынка) сэнсарных сістэм можа змяняцца ў залежнасці ад таго, дзе, з якой мэтай і якой аўдыторыяй выкарыстоўваецца дадзеная тэхніка. Напрыклад, інтэрактыўныя сістэмы «Куб» і «Стол» добра «ўпісаліся» ў гандлёвых і забаўляльных цэнтрах, сэнсарныя панэлі дазваляюць знаёміцца з меню кавярняў і рэстаранаў. У гандлёвых і спартыўных цэнтрах, кавярнях, дзе дэманструюцца спартыўныя спаборніцтвы, і, наогул, на аб'ектах, што наведвае вялікая колькасць людзей, якім трэба падаваць буйныя малюнкі, акрамя сэнсарных сістэм вы можаце сустрэць і відэасцены, якія вырабляюцца кампаніяй «Гарызонт», — з асобных модуляў можна збіраць экраны любых памераў з раздзяляльнасцю Full HD.

Ужо нікога не здзівіць электроннымі чэргамі, інфармацыйна-даведачнымі цэнтрамі і электроннымі прыёмнымі.

Як бачыце, рэвалюцыя ў свеце электронікі ўплывае і на нас — са звычаных спажыўцоў мы ўсё больш ператвараемся ў актыўных карыстальнікаў.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

УНП 191055812

БУДАЎНІЦТВА ПА ПРЫНЦЫПЕ «ЎСЁ ЎКЛЮЧАНА»

Як у краіне ўзводзяць жыллё камфорт-класа

Гісторыя шматпрофільнай кампаніі «Жылбудкамплект» пачалася больш за 18 гадоў таму. Тады гэта быў маленькі сямейны бізнес: у штаце налічвалася ўсяго сем чалавек. Праз гады кампанія не толькі стала арганізацыяй рэспубліканскага ўзроўню, але і пачала аказваць увесь комплекс паслуг у сферы дэвелапменту, праектавання, інжынірынгу і будаўніцтва. Дарэчы, за гэты перыяд было рэалізавана больш за 100 праектаў.

ЯПОНСКАЯ МЕТОДЫКА І НАШЫ КАШТОЎНАСЦІ

Аднак нязменным застаецца адно — разуменне місіі і дэвіз кампаніі: «Атрымлівайце асалоду ад жыцця. Мы паклапоцімся аб вашых марах». Як падкрэслівае **дырэктар ТАА «Жылбудкамплект» Ілья ВОЛАХ** *(на фота)*, для гэтага супрацоўнікі кампаніі імкнуцца апярэджваць будучыя запыты кліентаў, прапаноўваючы новую якасць і стыль жыцця. Дапрацаваныя ідэі ўвасабляюцца максімальна эфектыўна і ў адпаведнасці з агульнасусветнымі стандартамі.

На сённяшні дзень ТАА складаецца з групы кампаній, кожная з якіх адказвае за свой профіль, нягледзячы на тое, што ўсе яны ўваходзяць у адзіную структуру. «Звычайна на рынку ёсць заказчык будаўніцтва, генпадрадчык, субпадрадчыкі, асобныя бюро займаюцца праектаваннем. Калі ж інвестар прыходзіць да нас, то мы можам не толькі спраектаваць, пабудаваць і ўвесці будынак у эксплуатацыю, але і дадаткова падключыць банкаўскае фінансаванне, а таксама свой вопыт па продажах і маркетынгу. Такіх партнёрскіх праектаў у нашай скарбонцы ўжо нямала», — расказвае Ілья Паўлавіч.

Займаць устойлівую нішу на рынку, які імкліва змяняецца, кампаніі дазваляе бясспрэчны прафесіяналізм усіх супрацоўнікаў. Усяго ў штаце арганізацыі больш за 500 чалавек. Паспяхова каардынаваць работу такой вялікай кампаніі дапамагае японская метадалогія Кайдзэн. У яе аснове ляжаць прынцыпы беражлівай вытворчасці, а таксама бесперапыннае ўдасканаленне ўсіх працоўных працэсаў, што дазваляе падтрымліваць нязменна высокую якасць. Каб глыбока вывучыць новую метадалогію, спецыялісты «Жылбудкамплекта» праходзілі навучанне непасрэдна ў Японіі.

Яшчэ адзін не менш важны прынцып — чалавекаарыентаванасць. «Укараняючы кожную новую ідэю, мы імкнёмся паставіць сябе на месца будучага жыхара: наколькі яму будзе камфортна, ці ёсць яшчэ якія-небудзь спосабы палегчыць яму побыт. Прычым гэта правіла дзейнічае і пасля здачы дома або жылога комплексу. Мы ідзем на канструктыўны дыялог з жыхарамі, праводзім галасаванні, каб з першых вуснаў ведаць іх меркаванне і пажаданні і, улічваючы пэўныя моманты, удасканальваць наступныя праекты», — адзначыў дырэктар.

З 2015 года кампанія з'яўляецца адным з самых актыўных членаў Асацыяцыі забудоўшчыкаў аб'ектаў жыллёвага будаўніцтва. Са свайго боку яна робіць усё магчымае, каб паўплываць на прыняцце найбольш разумных рашэнняў, якія датычацца развіцця жыллёвай сферы.

Зараз «Жылбудкамплект» працуе над чатырма буйнымі жылымі комплексамі. У Маскоўскім раёне горада Мінска працягваецца забудова «Грушаўскага Пасада», а ў гэтым красавіку непадалёк ад яго з іншага боку праспекта Дзяржынскага пачалося ўзвядзенне комплексу пад назвай «Карамель». Акрамя таго, у ліпені стартуе продаж кватэр у двух вельмі цікавых аб'ектах у Брэсце і Кобрыне.

НАЙЛЕПШЫЯ Ў СВАЁЙ СПРАВЕ

Напэўна, самым вядомым на дадзены момант праектам кампаніі з'яўляецца жылы комплекс «Грушаўскі Пасад». Менавіта з ім «Жылбудкамплект» у 2010 годзе зайшоў на сталічны рынак нерухомасці ў якасці дэвелапера. Кампанія зрабіла на яго стаўку і не пралічылася: некалькі гадоў таму «Грушаўскі Пасад» стаў пераможцам прэстыжнай прэміі ў сферы нерухомасці Realt Golden Key ў намінацыі «Новабудоўля года камфорт-класа».

У першую чаргу павышаны камфорт абумоўлены размяшчэннем комплексу: за 10 хвілін язды ад цэнтра горада, да таго ж метро «Грушаўка» — у крокавай даступнасці, пры гэтым пад самімі дамамі ветка метро не праходзіць. Зараз участак уздоўж праспекта Дзяржынскага ды і ўвесь Маскоўскі раён у цэлым развіваюцца імклівымі тэмпамі, таму жыллё ў гэтых межах карыстаецца вялікім попытам у мінчан. Многія ўспрымаюць такую куплю як перспектыўную інвестыцыю.

Раней на месцы стыльнага комплексу знаходзіўся прыватны сектар, але яго аблічча не адпавядала значнасці галоўнай заходняй магістралі горада. Усе абавязацельствы па адсяленні «Жылбудкамплект» узяў на сябе: гэтымі пытаннямі займаецца спецыяльны аддзел, дзейнасць якога накіравана на тое, каб задаволіць усе маёмасныя правы грамадзян. Ім прапанавалі альтэрнатыўныя варыянты альбо ў самім «Грушаўскім Пасадзе», альбо ў найбольш зручных для іх месцах па Мінску — у аснове работы ляжыць індывідуальны падыход.

Па даных на канец мінулага года ў жылым комплексе было пабудавана 69 413 квадратных метраў жылля: здадзены каля 700 кватэр, а значыць, малады раён папоўніўся амаль дзвюма тысячамі новых жыхароў. У будучыні комплекс вырасце дакладна яшчэ ўдвая. Цяпер ёсць магчымасць купіць кватэры ў «Грушаўскім Пасадзе» на стадыі будаўніцтва. Цана за квадратны метр пачынаецца ад 2200 рублёў.

Паколькі гэта жыллё камфорт-класа, метраж кватэр досыць вялікі. У «Грушаўскім Пасадзе» ад 42 да 93 квадратных метраў, у «Карамелі» — ад 45 да 88 квадратных метраў. Кватэру можна набыць адна-, двух- і трохпакаёвую. Аднак пры правільным занаванні яе можна разбіваць на большую колькасць зон.

ТОЛЬКІ ІНДЫВІДУАЛЬНЫ ПАДЫХОД

Што ж выгадна вылучае жылыя комплексы, якія будуе «Жылбудкамплект»? Кампанія прынцыпова не прадае кватэры са свабоднай планіроўкай, затое прапануе на выбар некалькі варыянтаў дызайнерскіх рашэнняў па арганізацыі прасторы ў кватэры. Міжпакаёвыя перагародкі ўзводзяцца патрэбным чынам яшчэ на стадыі будаўніцтва, таму на выхадзе будучы жыхар атрымлівае планіроўку, у якой нічога не трэба мяняць, і тэхпашпарт, ужо ўзгоднены ў БРТІ: істотная эканомія і маральных, і часавых выдаткаў. Да таго ж праца «Жылбудкамплекта» славіцца высокай якасцю будаўніцтва і аддзелкі. Кліентам кампаніі не трэба непакоіцца аб разводцы электрыкі або атынкоўцы сцен — перад засяленнем у кватэры застаецца зрабіць толькі фінальнае аздабленне.

Але і пра тых, хто ад аднаго слова «рамонт» прыходзіць у жах, кампанія таксама паклапацілася: для ўсіх кватэр распрацаваны тыпавы дызайн-праект у лёгкім скандынаўскім стылі. Яго можна дапрацаваць, пагутарыўшы з дызайнерамі і расказаўшы аб асабістых густах. Напрыклад, у межах прапанаваных матэрыялаў можна змяніць каляровую гаму — дзякуючы гэтаму выключаецца шаблонны падыход: ідэнтычных праектаў, як і шпалер у кветачку і непрывабнага лінолеуму, у комплексе сапраўды не будзе. Толькі стыль, рацыянальнасць і камфорт. Цяпер супрацоўнікі кампаніі думаюць пра развіццё гэтай тэмы. Плануюць прапаноўваць кватэры з цалкам гатовым рамонтам, мэбляй, аксэсуарамі і нават бытавой тэхнікай. Зноў жа, кожны праект будзе падладжвацца пад густ жыхароў.

Акрамя таго, жыллё камфорт-класа прадугледжвае і больш зручнае выкарыстанне агульных зон. Так, на кожным паверсе размяшчаецца не больш за чатыры-пяць кватэр, у пад'ездах прадугледжаны чатыры ліфты: два грузавыя і два пасажырскія, у дамы праведзена оптавалакно. Жыхары таксама могуць выбраць варыянты шклення: звычайныя вокны або панарамныя. Балазе, з вокнаў адкрываецца надзвычайны від на адзін з цэнтральных праспектаў сталіцы.

Што датычыцца інфраструктуры, то ў Маскоўскім раёне яна добра развітая. Няма нястачы ні ў паліклініках, ні ў дзіцячых садках, ні ў школах. Акрамя метро, добра развітая і наземная транспартная сетка. А для аўтаўладальнікаў і ў «Грушаўскім Пасадзе», і ў «Карамелі» пабудуюць шматузроўневыя паркінгі. Дарэчы, пра «Карамель», у праекце на новы ўзровень значнасці выходзяць сямейныя каштоўнасці і хатняя ўтульнасць. Агульная прастора для жыльцоў — прасторная аб'яднаная кухня-гасцёўня, дзе вялікай сям'і можна збірацца за адным сталом і сустракаць гасцей — прадугледжана ў кожнай планіроўцы. Першая чарга будаўніцтва падыдзе ўжо ў канцы наступнага года. Усяго ж тут будуць пабудаваны два дамы на 14 пад'ездаў, падзеленыя адміністрацыйным будынкам — агульная колькасць кватэр каля 1000.

Дар'я КАСКО.
УНП 290017687.

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

❍ ДА ТЭМЫ

«Дарэчы, нават наведванне аддзела продажаў можа ператварыцца ў сапраўдную прыгоду, — расказвае начальнік аддзела маркетынгу Марына НАВІЦКАЯ. — Спачатку вам раскажуць пра магчымыя варыянты, пакажуць планіроўкі на малюнку, а таксама тое, як можа выглядаць гатовы інтэр'ер». А далей вас чакае віртуальнае падарожжа па будучым жыллі (не сыходзячы з месца!). Кліентам прапануюць прымерыць шлем віртуальнай рэальнасці і прагуляцца з дапамогай яго па дакладнай копіі рэальнай кватэры. Акрамя таго, разам са спецыялістам можна падняцца і ў гатовую кватэру з завершаным рамонтам. Толькі асцярожна: пабываўшы там, вы наўрад ці ўжо захочаце сыходзіць!

НАВУКОВЫЯ РАСПРАЦОЎКІ НА ВАРЦЕ ЗДАРОЎЯ

ЧАМУ ПРАДУКЦЫЯ НТП УП «УНІТЭХПРАМ БДУ» ЗАПАТРАБАВАНАЯ Ў МНОГІХ КРАІНАХ

Вучэбна-навукова-вытворчае рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства «Унітэхпрам БДУ» створана ў 1999 годзе. Сёння гэта інавацыйная навукова-вытворчая кампанія са статусам тэхналагічнага парка займаецца распрацоўкай і ўкараненнем у вытворчасць сучасных хіміка-аналітычных і спецыяльных тэхналогій, вытворчасцю інфармацыйна-вымяральнага абсталявання, прыбораў медыцынскага прызначэння, лекавых сродкаў і фармацэўтычных субстанцый. Прадукцыя прадпрыемства адзначана медалямі і дыпломамі міжнародных спецыялізаваных выстаўвак, салонаў інавацый і інвестыцый.

Прадпрыемства ўдзельнічае ў рэалізацыі разнастайных праектаў, уключаных у дзяржаўныя праграмы. Так, сёння яно выконвае каля 20 заданняў, у тым ліку ў межах Дзяржаўнай праграмы «Фармацэўтычныя субстанцыі і лекавыя сродкі», галіновай навукова-тэхнічнай праграмы «Дзіцячае харчаванне: якасць і бяспека» і іншых.

На прадпрыемстве дзейнічае навукова-тэхнічны савет. Распрацоўкі праходзяць поўны інавацыйны цыкл ад фармуліроўкі тэхнічнага задання да серыйнай вытворчасці.

«Унітэхпрам БДУ» — шматфункцыянальнае прадпрыемства. Цэнтры, створаныя на яго базе, вырашаюць разнастайныя задачы. Так, адзін з навуковых кластараў займаецца біятэхналогіямі і біяінжынерыяй. Службы інфармацыйна-вылічальных і інфармацыйна-вымяральных сістэм ствараюць разнастайнае абсталяванне: для дыстанцыйнага маніторынгу транспарту, сродкі перазапісу для рэгістратараў, асцылографы, генератары, аналізатары, многафункцыянальныя вымяральныя комплексы Alma Meter, аптычныя вымяральнікі тэмпературы, якія дазваляюць праводзіць ацэнку дэталяў пры высокіх тэмпературах ад 800 да 1300 градусаў. Медтэхніка, створаная на ўнітарным прадпрыемстве, запатрабаваная як у беларускіх медыцынскіх установах, так і за межамі краіны. Так, спірометры для ацэнкі стану дыхання сёння дазваляюць не толькі правесці даследаванне: праграма запамінае даныя, сабраныя падчас медаглядаў, параўноўвае і можа даваць рэкамендацыі. Сярод навінак — сумесная распрацоўка БДУ і РНПЦ анкалогіі — устаноўка агульнай гіпертэрміі «Пціч М» для комплекснага лячэння ў спецыялізаваных клініках.

Наогул, спатрэбіцца час, каб расказаць пра ўсю прадукцыю, над якой працуе прадпрыемства. Тут вырабляюцца нават дыягнастычныя наборы для паліклінік для аналізаў крыві і дэталі для будучага студэнцкага спадарожніка. Але давайце сёння больш пагаворым пра прадукцыю, якая ў апошні час была адзначана асаблівымі ўзнагародамі.

МЕДАЛІ ЗА НАЙЛЕПШЫЯ РАСПРАЦОЎКІ

У 2015 годзе на НТП УП «Унітэхпрам БДУ» адкрыта вытворчасць фармацэўтычных субстанцый і лекавых сродкаў, якая адпавядае стандартам GMP.

На гэтым прадпрыемстве (і больш нідзе ў свеце) выпускаюцца ўнікальныя прэпараты, абароненыя патэнтамі. Дадзеная прадукцыя адзначана самымі высокімі ўзнагародамі на міжнародных конкурсах. Так, лекавыя прэпараты, распрацаваныя сумесна з Навукова-даследчыцкім інстытутам фізіка-хімічных праблем, на конкурсе «Найлепшы інавацыйны праект і найлепшая навукова-тэхнічная распрацоўка года» ў Санкт-Пецярбургу атрымалі залатыя медалі ў намінацыі «Найлепшы інавацыйны праект у галіне жывых сістэм (біятэхналогіі)».

— Калі паўстала пытанне аб вытворчасці падобных лекаў, мы звярталіся на беларускія заводы медпрэпаратаў, аказалася праблематычна на іх наладзіць такі выпуск. Гэта малатанажная, навукаёмістая вытворчасць (у нас у тэхналагічным працэсе на вытворчасці задзейнічана тры кандыдаты навук), — расказвае **дырэктар прадпрыемства, кандыдат хімічных навук Павел БЫЧКОЎСКІ.** — Сёння вытворчыя магутнасці нашага прадпрыемства дазваляюць цалкам закрыць патрэбу і Беларусі, і краін былога Савецкага Саюза ў пэўных прэпаратах. Больш за тое, мы працуем у звязцы з айчыннымі вытворцамі, пастаўляем для іх фармацэўтычныя субстанцыі, а на заводзе вырабляюць гатовыя лекавыя формы, дзякуючы чаму ў Беларусі лекавыя сродкі вырабляюцца па поўным цыкле.

Калектыў НПЦ Харчовых тэхналогій.

Ужо многія краіны свету зацікавіліся распрацоўкамі беларускіх вучоных, але выхад такой прадукцыі на замежныя рынкі патрабуе немалых затрат, бо ў кожнай краіне трэба асобна праходзіць рэгістрацыю прэпаратаў, і кампаніі-дылеры дапамагаюць прасоўванню такой неабходнай прадукцыі на свае рынкі. Так, дзякуючы падтрымцы шведскага боку на адзін з прэпаратаў, які выпускаецца на НТП УП «Унітэхпрам», пададзены патэнт у 56 краінах свету!

– У свеце зарэгістравана ўсяго толькі чатыры прэпараты для лакальнай хіміятэрапіі, тры з іх – у Беларусі, – расказвае Павел Бычкоўскі. – Трэба сказаць, што распрацоўкі вучоных дазваляюць сэканоміць сродкі на лячэнні пацыентаў. Напрыклад, амерыканскі аналаг даражэйшы за беларускі прэпарат у 50 разоў і каштуе 15—18 тысяч доларaў за ўпакоўку!

«Унітэхпрам БДУ» працягвае далейшае супрацоўніцтва з НДІ фізіка-хімічных праблем. І сёння ў межах такога навуковага кластара вядзецца работа па стварэнні новых прэпаратаў. Таксама будуць пашырацца і сферы ўжывання ўжо створаных лекавых сродкаў.

АДРАСНАЕ ХАРЧАВАННЕ

Цэнтр харчовых тэхналогій УП «Унітэхпрам БДУ» займаецца даследаваннем, распрацоўкай і вытворчасцю харчовых дабавак для хлебапякарнай, мясной, кандытарскай галін.

— Харчаванне — найважнейшы складнік здаровага ладу жыцця. Прадукты новага пакалення павінны забяспечваць арганізм чалавека жыццёва неабходнымі кампанентамі. Прычым сёння харчаванне становіцца персаналізаваным, адрасным, — заўважае **кіраўнік навукова-вытворчага цэнтра харчовых тэхналогій Таццяна МАДЗІЕЎСКАЯ.** — Трэба ўлічваць узроставыя асаблівасці, прафесійныя заняткі. Так, у спартсменаў і работнікаў інтэлектуальнай галіны патрэбы могуць быць рознымі. Змяніўся лад жыцця, раней пры большых фізічных нагрузках чалавек для кампенсацыі энергетычных затрат вымушаны быў ужываць больш ежы і з гэтага аб'ёму ён «набіраў» карысныя элементы. Пры разумовай і сядзячай працы патрабуецца менш ежы, і вітамінаў і мінералаў, неабходных для нармальнага функцыянавання арганізма, ужо можа не хапаць. Акрамя таго, павялічыўся ўзровень ужывання рафінаваных прадуктаў, але ўсё тое, што забіраецца падчас перапрацоўкі, неабходна кампенсаваць. Нельга забывацца і пра прыродныя асаблівасці, дэфіцыт на нашай тэрыторыі пэўных элементаў. Напрыклад, у Беларусі не вырошчваюцца расліны, якія накопліваюць селен, і пажадана, каб такія элементы былі ў гатовых прадуктах. Таму сёння так многа ўвагі ўдзяляецца функцыянальнаму харчаванню, стварэнню ўзбагачаных прадуктаў.

Зразумела, каб здаровая ежа трапіла на стол як мага большай колькасці людзей, найперш трэба працаваць з прадуктамі масавага ўжывання. Таму прадпрыемства так актыўна займаецца распрацоўкай карысных кампанентаў для выкарыстання пры вытворчасці хлеба.

Але карыснай можа быць і соль. Аб праблеме залішняга ўжывання солі сёння гавораць ва ўсім свеце. Напрыклад, сяроднестатыстычны беларус атрымлівае яе каля 15—20 грамаў у суткі (замест рэкамендаваных 5). Шмат солі ў гатовых прамысловых прадуктах (дзе яна выкарыстоўваецца не толькі для смаку, але і як кансервант). Але на прадпрыемстве знайшлі добрае рашэнне, як на 10—30 працэнтаў знізіць яе ўжыванне. У межах дзяржаўнай праграмы распрацавалі прадукцыю серыі «Універсум» з паніжанай колькасцю хлорыстага натрыю. Рэальна, ужываючы менш солі, дзякуючы прана-араматычным кампанентам мы не будзем адчуваць яе недахопу. Больш за тое, фітасолі змяшчаюць карысныя кампаненты (вітаміны і амінакіслоты), якія станоўча ўплываюць на работу сардэчна-сасудзістай сістэмы, і гэта пацверджана клінічнымі выпрабаваннямі (на іх падставе Міністэрства аховы здароўя Беларусі надало фітасолям статус дыетычнага прафілактычнага прадукту). Гэта выключна беларуская распрацоўка, аналагаў у свеце не існуе. Дадзеная прадукцыя ўзнагароджана дыпломам (з уручэннем спецыяльнага прыза) на выстаўцы ў Санкт-Пецярбургу «Ні Тесн 2018», а таксама стала пераможцам у нацыянальным конкурсе як «Найлепшы прадукт года» і «Навінка года».

Дарэчы, набываючы фітасоль у магазінах, можна сэканоміць на прыправах, ужо створана некалькі такіх прадуктаў, якія розняцца сваёй араматыкай.

Сёння стаіць задача знізіць колькасць солі ў прамысловых прадуктах. У прыватнасці, зараз сумесна з Інстытутам мяса-малочнай прамысловасці распрацоўваюцца рэцэптуры з выкарыстаннем фітасолю для вытворчасці мясных вырабаў, створаны новыя фітасолі «Салюс» і «Крэда».

ШТО ДАЛЕЙ?

Дзякуючы статусу тэхнапарка, дзяржаўнай падтрымцы кампанія мадэрнізуецца, будуць створаны новыя вытворчасці.

Закупляецца дарагое абсталяванне для рэзідэнта тэхнапарка — кампаніі «Прабіятэх», і потым пачнецца выпуск ветэрынарных прэпаратаў (уся гэта прадукцыя абароненая патэнтамі, мае сусветны ўзровень навізны і арыентаваная ў тым ліку на экспарт).

Будзе праводзіцца конкурс стартапаў, каб уцягнуць маладых вучоных у працэс камерцыялізацыі ўласных распрацовак. У перспектыве стварэнне мадэлі «Універсітэт 3.0» — гэта сувязь навукі з вытворчасцю дазволіць знайсці таленавітых спецыялістаў і даць ім фінансавыя магчымасці для прафесійнага росту.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.

УНП 190007888

Калектыў Службы лекавых сродкаў.

ЯК СУМЯСЦІЦЬ ЭНЕРГІЮ ВЯЛІКАГА ГОРАДА І СПАКОЙ ПРЫРОДЫ?

Гэта ведаюць забудоўшчыкі жылога комплексу «Гранд Хаус»

Жылы комплекс камфорт-класа мае выключна ўдалае размяшчэнне. На адной з цэнтральных транспартных артэрый горада — праспекце Дзяржынскага, літаральна за пару дзясяткаў метраў ад метро «Грушаўка» і за пяць хвілін язды да цэнтра. Пры гэтым побач з комплексам знаходзіцца маляўнічы Грушаўскі сквер. І гэта толькі пачатак пераваг выбару менавіта гэтага месца, дзе хочацца жыць...

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Камфорт з дастаўкай на дом

Кампаніяй-забудоўшчыкам «Гранд Хаусу» з'яўляецца ТАА «Датч Стар». Асноўныя задачы кампаніі — выкананне функцый заказчыка пры будаўніцтве жылых дамоў, гэта значыць фарміраванне патрабаванняў да падрадных арганізацый, кантроль за выкананнем работ і продаж гатовых аб'ектаў. Будаўніцтва комплексу пачалося ў 2013 годзе, аднак тады паўсталі праблемы з тэрмінамі. Каб вырашыць праблему, быў цалкам зменены склад работнікаў на чале з дырэктарам. Да **кіраўніцтва прыйшоў малады і энергічны Дзяніс ЗАМОРАЦ**, які сабраў вакол сябе высокакваліфікаваную каманду спецыялістаў. Як вынік — зараз будаўніцтва комплексу ідзе нават апераджальнымі тэмпамі.

З 2016 года ўвялі ў эксплуатацыю два пад'езды — чацвёрты і пяты. Усяго ж комплекс уяўляе сабой 20—25-павярховы дом з пераменнай паверхавасцю і будынкам буйнога медыцынскага цэнтра. Здача наступных двух пад'ездаў запланаваная на сёлетні ліпень. Ужо пачалі будаваць восьмы і дзявяты пад'езды, тэрмін здачы — ліпень 2019- га, а пераехаць у кватэры дзясятага і адзінацатага пад'езда першыя жыхары змогуць у лютым 2020-га. Другая чарга будаўніцтва будзе рухацца перпендыкулярна праспекту Дзяржынскага па вуліцы Шчорса: там узвядуць яшчэ тры пад'езды, плануецца, што тэрмін іх здачы — 2022 год. Будаўніцтва пачнецца ўжо гэтай восенню.

Акрамя таго, у комплексе з'явяцца два падземныя паркінгі на 400 месцаў кожны, трапіць у якія можна будзе не выходзячы з пад'езда. Там жа будуць абсталяваны і спецыяльныя памяшканні для захоўвання роварaў, а наверсе з'явяцца гасцявыя парковачныя месцы для аўтамабіляў. Што да самога дома, то першы-другі паверхі ў ім будуць аддадзены пад гандлёвыя і адміністрацыйныя памяшканні. Пакуль кампанія фарміруе аптымальны набор прадстаўленых арганізацый, каб у жыхароў была магчымасць вырашыць большасць бытавых пытанняў, не пакідаючы межаў комплексу.

Зялёны аазіс у цэнтры Мінска

Кажучы пра папулярнасць таго ці іншага комплексу ў патэнцыйных кліентаў, Дзяніс Рыгоравіч з усмешкай адзначае, што важныя ўсяго тры фактары: месца, месца і яшчэ раз месца. Дарэчы, праспект Дзяржынскага — выдатнае таму пацвярджэнне. Малады Маскоўскі раён з развітой інфраструктурай, зручнай дарожнай сеткай і транспартнымі камунікацыямі выклікае ў мінчан непадробную цікавасць. Не дзіўна, што па планах гарадскіх улад тут павінны размяшчацца найлепшыя ўзоры жылой забудовы. А вось драўляныя баракі пасляваеннага часу, што былі тут раней, зусім не ўпісваліся ў аблічча тэрыторыі, якая так імкліва развіваецца.

— Тут былі знесены шэсць васьмікватэрных драўляных дамоў. Да жніўня будуць рэалізаваны маёмасныя правы жыхароў яшчэ двух, апошніх дамоў, і яны таксама будуць знесены. Нашы спецыялісты зрабілі ўсё магчымае, каб улічыць усе пажаданні жыхароў раёна і пазбегнуць канфліктных сітуацый падчас адсялення, — падкрэсліў дырэктар.

Акрамя гэтага кампанія «Датч Стар» узяла на сябе абавязацельства па будаўніцтве камфортнай і сучаснай дашкольнай установы. Яна размесціцца на месцы былога кінатэатра «Авангард». Каб трапіць у дзіцячы садок, жыхарам «Гранд Хаус» нават не прыйдзецца пераходзіць дарогу — шлях пройдзе праз Грушаўскі сквер. Дарэчы, забудоўшчык таксама плануе яго дадаткова азеляніць і мадэрнізаваць. У перспектыве тут можна будзе ладзіць працяглы шпацыр з дзецьмі, праводзіць дворовыя святы і займацца спортам. Прыхільнікі веларуху размяшчэнне комплексу таксама ацэняць — уздоўж праспекта Дзяржынскага ідзе веладарожка.

Што датычыцца высокай канкурэнцыі сярод забудоўшчыкаў з-за прыцягальнасці абранага месца, то Дзяніс Заморац падкрэслівае, што дзякуючы ёй, павышаецца якасць. Сярод сваіх пераваг кампанія «Датч Стар» называе выкарыстанне выдатных матэрыялаў, стыльны дызайн і выкананне заяўленых тэрмінаў.

Двухузроўневы пентхаус, свая тэраса і «сакрэтная» лоджыя

У жылым комплексе «Гранд Хаус» можна падабраць сабе камфортнае жыллё па метражы ад 39 да 140 квадратных метраў. Кошт стартуе ад 2240 рублёў за квадратны метр. Ёсць растэрміноўка на перыяд будаўніцтва, пры першапачатковым унёску 50 %. Банкі-партнёры БелВЭБ і БПС-Банк прапануюць бонусную праграму крэдытавання, аднак працуе кампанія і з усімі іншымі банкамі, якія зручныя кліентам.

Дарэчы, з выбарам варта паспяшацца: у восьмым-дзявятым пад'ездах, якія будуць здавацца праз год, выкуплена ўжо каля 70 % кватэр. Затое ўсе варыянты пакуль даступныя ў дзясятым-адзінаццатым пад'ездах, якія здадуць у эксплуатацыю на паўгода пазней. Тут будучыя жыхары могуць выбраць, які выгляд з вокнаў ім даспадобы: урбаністычны — на праспект Дзяржынскага, ці прыродны — на Грушаўскі сквер, або абодва адразу.

На 19—20 паверсе комплексу размешчаны двухузроўневыя пентхаусы, якія можна аднесці да прэміум-сегмента. Гэта выдатная прапанова для тых, хто марыць пра камфорт загараднага дома, але не хоча губляць зручнасць гарадской інфраструктуры. Плошча пентхауса каля 140 метраў квадратных, што параўнальна з памерамі сярэдняга прыватнага дома. Па сутнасці гэта шматпакаёвая кватэра з санвузламі на двух паверхах і зонай гасцёўні, якая, дзякуючы другому святлу, аб'ядноўвае абодва ўзроўні. Таксама ў комплексе можна будзе набыць і кватэру з тэрасай, якая выходзіць на сквер, — гэта пашыраны варыянт лоджыі з падстрэшкам ад сонца.

Для саміх лоджый, у якіх шкленне ўладкавана па прынцыпе французскіх вокнаў, праекціроўшчыкі прыдумалі сваю «фішку»: люстраны эфект пад назвай «хамелеон». З унутранага боку акно абсалютна празрыстае, а з вонкавага — зацемненае: чым ярчэйшае сонца, тым мацнейшы эфект. Дзякуючы гэтаму лоджыю можна выкарыстоўваць абсалютна па-рознаму: і як рабочы кабінет, і як зімовы сад, і як гаспадарчы пакой — з вуліцы нічога праглядацца не будзе.

У кватэрах, для зручнасці жыхароў, прадугледжана якаснае чарнавое аздабленне і вольная планіроўка, каб кожны мог уладкаваць жыллё ў адпаведнасці са сваімі асабістымі патрэбамі і густам. Выдзелены толькі кухня і санвузел. Пры неабходнасці спецыялісты аддзела продажаў могуць прадэманстраваць гатовую трохпакаёвую кватэру ва ўжо здадзеным пад'ездзе. А складзі аптымальную планіроўку дапаможа дызайнер, які працуе ў штаце кампаніі.

Як падкрэсліла **кіраўнік праекта Анжэла БАБІЧАВА**, комплекс будуецца

з экалагічных матэрыялаў. Гэта маналітны дом, пры ўзвядзенні якога выкарыстоўваецца цэгла для вонкавых сцен, керамзітабетонны блок для ўнутраных сцен і перагародак, для ўцяплення — каменная вата: гэтыя матэрыялы «дыхаюць» і не назапашваюць вільгаць. У аздабленні ўжываецца цэментна-пясчаная тынкоўка і сцяжка. Таксама ўсталёўваюцца вокны REHAU з высокімі энергазберагальнымі і шумаізаляцыйнымі ўласцівасцямі. У пад'ездах стаяць бясшумныя ліфты OTIS. Тэхналагічнасць спалучаецца са стыльным дызайнам: гэта бачна як па фасадзе будынка, так і па цікавых уваходных групах. Трапляючы сюды, адразу разумееш: справу робяць прафесіяналы!

Дар'я КАСКО.

УНП 191061486

Извещение о проведении первых и повторных открытых аукционов по продаже земельных участков в частную собственность

Организатор: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 47-20-56

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010147, площадью 0,0843 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена:** 25 670,22 руб. **Задаток:** 1 000 руб.
Лот № 2. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010140, площадью 0,0873 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 2 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена:** 26 583,13 руб. **Задаток:** 1 000 руб.
Лот № 3. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010142, площадью 0,0827 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 4 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений водоснабжения. **Нач. цена:** 25 182,14 руб. **Задаток:** 1 000 руб.
Лот № 4. Земельный участок с кадастровым №240100000003010150, площадью 0,0839 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, У-5 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена:** 25 547,70 руб. **Задаток:** 1 000 руб.
Лот № 5. Земельный участок с кадастровым № 240100000003010146, площадью 0,0857 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Сенненская, участок № 7 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Нач. цена:** 26 095,06 руб. **Задаток:** 1 000 руб.
Лот № 6. Земельный участок с кадастровым № 240100000003009627, площадью 0,1429 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Шевардиновская, 6 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Нач. цена:** 26 906,41 руб. **Задаток:** 1000 руб.

Дата, время и место проведения повторного аукциона: 27.07.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и приема документов: с 09.07.2018 с 8.30 по 26.07.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000 ф-л № 200 ВОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. Условия аукциона: в двухмесячный срок в установленном порядке обратиться за гос. регистрацией права на зем.участок в РУП «Витебское агентство по гос. регистрации и зем. кадастру»; обратиться в установленном порядке за получением разрешительной документации на строительство объекта в администрацию Первомайского района г. Витебска в срок, не превышающий 3 месяца с даты гос. регистрации права на зем. участок (по лотам №№ 1–5); получить в установленном порядке разрешение на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца, с момента гос. регистрации права на зем. участок (по лоту № 6); в течение 6 месяцев (для юридических лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство в сроки, установленные законодательством (определенные ПСД). Для участия в аукционе приглашаются граждане, негосударственные юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр. лиц Республики Беларусь). По заявлению покупателя Витебским горисполкомом может предоставляться рассрочка оплаты земельного участка

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
Лот № 1. Земельный участок с кадастровым № 240100000003009277, площадью 0,1143 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Шевардиновская, 2А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 В. **Нач. цена:** 21522,96 руб. **Задаток:** 1000 руб.

Дата, время и место проведения аукциона: 08.08.2018 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 09.07.2018 с 8.30 по 07.08.2018 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5, в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с BY14AKBB36423020002802000000 ф-л № 200 ВОУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY21200, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский горисполком. **Условия аукциона:** обратиться за гос. регистрацией права, ограничения (обременения) права на зем. участок в течение 2 месяцев со дня утверждения в установленном порядке протокола аукциона либо признания аукциона несостоявшимся; получить в установленном порядке разрешения на проведение проектно-изыскательских работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца; в течение 6 месяцев (для юридических лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения в установленном порядке проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем. участка; осуществить строительство в сроки, определенные ПСД. Для участия в аукционе приглашаются граждане, негосударственные юр. лица, консолидированные участники (двое и более граждан, негосударственных юр. лиц Республики Беларусь). По заявлению покупателя Витебским горисполкомом может предоставляться рассрочка оплаты земельного участка

Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка
— У першую чаргу я зацікавіўся абнаўленнем ікон. Калі старыя, пачарнелыя ад часу абразы нечакана становяцца новымі, бліскучымі, нават пашкоджанні знікаюць. Гэтаму ёсць вельмі шмат дакументальных пацвярджэнняў у архівах. Ужо пасля таго, як мы знайшлі гэтыя звесткі, мы перайшлі да апытання людзей на мясцовасці. Гэта найбольш масавы цуд, які быў распаўсюджаны на тэрыторыі нашай краіны. Але ёсць яшчэ міратачэнне, кроватачэнне, пераадлюстраванне ікон (калі выява сама сабой наносіцца на нейкую паверхню).

— Ці заўсёды існуе навуковае тлумачэнне такім з'явам?

— Некаторым можна знайсці пэўнае навуковае ці рацыянальнае тлумачэнне. Калі на іконе з'яўляецца вільгаць, магчыма, яе з цёплага памяшкання перанеслі ў халоднае. Ці выдзяляюцца смолы, ці нейкія хімічныя працэсы акіслення адбываюцца. На сонцы абраз, напрыклад, набывае насычаны колер. Але ў дадзеным выпадку нас больш цікавіць інтэрпрэтацыя цуду. Пры гэтым даволі часта навуковая метадалогія буксуе. І часам навукоўцы пачынаюць падганяць з'яву пад нешта ім ужо вядомае. Мы на падобны падыход не хварэем. Спачатку імкнёмся разглядзець усе рацыянальныя тлумачэнні — і часцей за ўсё менавіта яны адказваюць на пытанне, чаму так адбылося, — але, калі яны канчаюцца, пераходзім да нетрывіяльных гіпотэз. Разглядаем версіі, якія не зусім прынятыя і могуць растлумачыць дадзены выпадак.

Даследчыкі таксама вывучаюць незвычайныя камяні і помнікі. Гэты знаходзіцца каля былой вёскі Шырнавічы Крупскага раёна.

Мяне ў першую чаргу цікавяць часавыя і тэрытарыяльныя аспекты цудаў. Каб выявіць пэўныя гады-ўсплёскі, калі цудаў было больш, і ў якіх раёнах яны адбываліся.

ДЗЕ НАЧАВАЦЬ НЕ ВАРТА

— Ёсць меркаванне, што цудаў стала менш, таму што людзі сталі больш адукаваныя. Пагодзіцеся з гэтым?

Апытанне жыхароў вёскі Ясьманаўцы Вілейскага раёна, у якіх абнавіліся іконы.

— Тое, што колькасць памяншаецца, — гэта відавочна і зразумела. Некаторыя знікаюць, трансфармуюцца пад уплывам светапогляду. Зараз амаль не сустрэнеш расказаў пра русалак. Але, калі пачнеш размаўляць з бабулямі 80—90-гадовымі, яны раскажуць, колькі раней было выпадкаў. Яны гавораць: «Зараз усе русалкі перавяліся». Таксама можна гаварыць пра назіранне НЛА. У 90-я іх было значна больш.

Гэтыя з'явы маюць яскравую цыклічнасць. І ў чарговы цыкл могуць бачыць нешта зусім іншае. То-бок наступны раз гэта могуць быць не русалкі, НЛА, а «людзі ў чорным», напрыклад. Да таго ж ёсць і гарадскі фальклор. З'явы трансфармуюцца. І цыклічнасць цікавая з пункту погляду розных аспектаў, у тым ліку эпідэміялагічнага, гістарычнага, сацыякультурнага...

— За гэты час што самае страшнае вы бачылі?

— Адно з самых жудасных месцаў, дзе я начаваў, — гэта могілкі для самагубцаў. Там яшчэ пахаваны неідэнтыфікаваныя трупы і няма надпісаў на помніках. Пару гадоў таму была іншая незвычайная экспедыцыя, калі ўсім стала не па сабе. Гэта было ў Полацкім раёне. У нас была інфармацыя, што ў будынку раней знаходзіўся прытулак для душэўнахворых, а зараз там Дом культуры. Па нашых даных, тыя, хто там начаваў, нашмат не затрымліваліся. Нават міліцыянер, які ахоўваў дакументы, выбег адтуль, бо пачуў удары з прыбіральні, у якой нікога не было. Ён вырашыў начаваць у машыне. Мы даследавалі гэты будынак з дапамогай комплексу апаратуры. Шчыра скажу, нам было страшна ісці ноччу ў падвал. Ва ўсіх быў нейкі ірацыянальны страх, і ў выніку мы туды не спусціліся. А раніцай, калі мы лягліна крэслы паспаць, я палажыў свой дыктафон побач. Прачынаюся — дыктафона няма. А там усе запісы з экспедыцыі. Мы начавалі ўтрох, усе дзверы былі зачынены. У выніку знайшлі яго выпадкова забітым у вугал на дне рукзака аднаго з членаў каманды. Плюс, калі я размаўляў з дырэктарам гэтага Дома культуры, кожны раз побач з ёй нешта падала ці адбывалася, як папярэджанне для нашага прыезду.

— Мне падаецца, вам было б цікава разабрацца і з такімі гучнымі справамі, як перавал Дзятлава, напрыклад.

— Мы супрацоўнічаем з расійскім аб'яднаннем «Касмапошук», якое таксама і гэтым займаецца. Да таямніц першай велічыні мы дакраналіся. Два гады таму была сумесная экспедыцыя на перавал Дзятлава. Удзельнічалі нашы людзі і ў экспедыцыях на Мядзведзіцкую градуў Валгаградскую вобласць. Там вельмі часта бачаць шаравыя маланкі. У большасці экспедыцый на самыя цікавыя расійскія аб'екты хтосьці з нашых удзельнічае. Мы выязджаем у памежныя з Беларуссю раёны. У прыватнасці, даследавалі Бранскую вобласць, дзе быў выпадак агнявога полтэргейсту. Выязджалі ў Смаленскую вобласць, Латвію, Украіну. Зараз у нас у Літву будзе экспедыцыя. Я сам некаторы час жыў у Расіі, і ў мяне два гады былі выезды толькі па ёй. Мы арганізавалі праект «Даследаванне гарадскіх легендаў». Правяралі іх з дапамогай апаратуры.

НАВУКОВЫ ПАДЫХОД

— Падаецца, тая інфармацыя, што вы збіраеце, павінна быць цікавая гісторыкам ці этнографам.

— Сапраўды. Мы абменьваемся звесткамі з фальклярыстамі, гісторыкамі. З 2015 года арганізавалі канферэнцыю «Таямнічая Беларусь», у якой ухіл робіцца больш на этнаграфію, чым на анамальныя з'явы. І вось зараз выпускаем чацвёрты зборнік гэтай канферэнцыі. У ёй удзельнічаюць прафесійныя археолагі, гісторыкі, міфолагі, фальклярысты. У нас заўсёды два-тры ўдзельнікі з іншых краін: Латвіі, Расіі, Украіны. Устанаўліваем кантакты з навукоўцамі, якім былі б цікавы нашы даследаванні. Яны ў сваю чаргу таксама даюць нам інфармацыю па сваіх праектах, архіўныя даныя. Гэта цеснае супрацоўніцтва не першы год цягнецца.

— Як падчас вашых экспедыцый мясцовыя жыхары рэагуюць на пытанні аб містыцы?

— У асноўным ставяцца спакойна. Але ў адной з экспедыцый нас прынялі за зборшчыкаў металалому. Бывала, што і за валацуг прымалі. Хтосьці гаварыў, што мы прыйшлі пенсію красці, бо яе толькі далі. Але гэта ўсё вельмі рэдкія прыклады, хутчэй выключэнні. Ёсць і вельмі пазітыўная рэакцыя. Часта сутыкаюся з тым, што чалавек мне гаворыць: «Нікому ў жыцці не расказваў — вам першаму». То-бок ступень даверу вельмі высокая.

— Якая ваша любімая легенда аб прывідзе? Вы ўжо адной-чы расказвалі карэспандэнту «Звязды», што, па вашых даследаваннях, Чорная панна Нясвіжскага замка — гэта зусім не Барбара Радзівіл...

— Вось гэта і ёсць мая любімая легенда. Яна перакручана да немагчымасці і паказвае, як узнікаюць легенды такога кшталту, трансфармуюцца, ўкараняюцца. Я яе разглядзеў з розных пазіцый. Столькі матэрыялаў накапаў. Мабыць, сёлета чарговую экспедыцыю правядзём на гэтую тэму. Ёсць ідэя кніжку па гэтай легендзе выпусціць, бо столькі часу сядзелі ў архівах і працавалі са сведкамі.

— А што наконт гісторый пра скарбы з золатам?

— Мы не знаходзілі, але легенды гавораць, што яны знаходзяцца пад камянямі, побач з культавымі дрэвамі, на нейкіх узгорках. У нас як? У кожным другім Святым возеры і ў кожным трэцім балоце затоплена карэта Напалеона з золатам. Вядома, гэта ўсё ў асноўным няпраўда. Але знаходзяцца тыя, хто шукае, капае дзясяткі гадоў. Самы непрыемны вопыт быў у нас, калі мы расказалі пра адзін комплекс з камянёў.

Наруб каля вёскі Зарэчка Драгічынскага раёна.

Пасля публікацыі на нашым сайце хтосьці яго раскапаў. Камяні скінулі, выкапалі велізарную яму. Хоць там нічога і не было. Таму справа чорных капальнікаў жыве. Там столькі сваіх «фішачак»: не кожнаму скарб дасца, ён можа стаць зайцам і збегчы, яго трэба яшчэ ведаць, як узяць...

Надзея АНІСОВІЧ.

■ Сугучча

УКРАІНСКІЯ ЗАЦІКАЎЛЕННІ БЕЛАРУСІСТЫКАЙ

У Палтаўскім нацыянальным педагагічным універсітэце імя У. Караленкі створана ўнікальная навукова-даследчыцкая лабараторыя.

Дацэнт кафедры журналістыкі Глеб Кудрашоў, добра вядомы сваімі зацікаўленнямі ў беларуска-ўкраінскіх культурных і гістарычных стасунках, стварыў навуковую лабараторыю «Беларуска-Украінскія Кніжныя Сувязі» (БУКС). Яшчэ з 2012-га малады даследчык рэгулярна друкуецца з артыкуламі, навуковымі паведамленнямі ў Беларусі, выступае на розных канферэнцыях. Глеб Кудрашоў падтрымлівае трывалыя стасункі з украінскай дыяспарай у Беларусі.

Плёнам зацікаўленняў беларуска-ўкраінскімі стасункамі стала і кніга Г. Кудрашова «Малітва Тараса пад беларускім небам», у якой даволі падрабязна разгледжаны ўсе пытанні мемарыялізацыі жыцця і творчасці Вялікага Кабзара ў Беларусі. Выданне, якое даследчык прадставіў чытачу на ўкраінскай мове, даўно разышлося і фактычна стала рарытэтам. Пра кнігу пісалі ў беларускім і ўкраінскім друку, размова пра яе ішла і на круглым стале беларускіх і замежных пісьменнікаў сёлета ў Гродне на чарговым фестывалі нацыянальных культур. Зараз рыхтуецца пераклад кнігі на беларускую мову. Мяркуецца, што «Малітва Тараса пад беларускім небам» пабачыць свет у мінскім выдавецтве «Мастацкая літаратура».

СТАРОНКІ БЕЛАРУСКАЙ ПАЭЗІІ АДКРЫВАЕ ГРОЗНЫ

У Нацыянальнай бібліятэцы Чачэнскай Рэспублікі імя Абузара Айдамірава прайшла прэзентацыя кнігі «Старонкі беларускай паэзіі».

Зімовы сад рэспубліканскай бібліятэкі — сакральнае месца для літаратуры, мастацтваў Чачні. Сюды прыходзяць паэты, тут ладзяцца сустрэчы, прэзентацыі, імпрэзы. Гэтым разам у прасторы культурнага пабраціцтва, духоўнага крынічнага асяроддзя сабраліся літаратары, якім цікавы мастацкі свет Беларусі. Нагода — прэзентацыя ўжо вядомай і ў Мінску кнігі перакладаў Адама Ахматукаева «Старонкі беларускай паэзіі». У зборніку пад адной вокладкай сабраліся вершы Францыска Скарыны, Якуба Коласа, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі і іншых майстроў беларускага прыгожага пісьменства.

Паэт Руслан Юсупаў адзначыў у сваім выступленні: «Як мне падаецца, нашага Адама Ахматукаева можна смела залічваць у літаратурныя паслы Рэспублікі Беларусь у Чачэнскай Рэспубліцы. І ў гэтым яму, несумненна, дапамагаюць паездкі на Беларусь, сустрэчы з беларускімі пісьменнікамі».

— Яшчэ ў 1982 годзе наш вялікі паэт Алвадзі Шахіеў надрукаваў у другім нумары альманаха «Орга» за 1982 год верш «А хто там ідзе?» народнага песняра Беларусі Янкі Купалы, — сказаў на прэзентацыі ў Грозным паэт і перакладчык Адам Ахматукаеў. — Ведаю, што гэты твор надрукаваны і ў Беларусі на чачэнскай мове. І мне здавалася, што я ніколі не адважуся пайсці па шляху засваення, прачытання багатай на вобразы і сімвалы нацыянальнай паэзіі. Але вось у 2016 годзе пабываў у Мінску, пазнаёміўся з многімі беларускімі паэтамі. І пачаўся мой шлях уваходжання ў багаты мастацкі свет. Тады, у 2016-м, я і пераклаў першы беларускі верш.

На літаратурнай імпрэзе прысутнічалі члены Саюза пісьменнікаў Чачэнскай Рэспублікі — вядомыя паэты Руслан Юсупаў і Лечы Ясаеў, маладыя творцы Фаіза Халімава, Тумані Вісітаева, Альбіка Сулейманава, Аза Масаева, Бувайсар Джамбекаў, галоўны рэдактар часопіса «Гоч» Пецімат Пеціраева. Яны чыталі свае вершы, гаварылі пра зацікаўленасць беларускай літаратурай. Варта нагадаць, што ў апошні час і ў Беларусі з'явіліся публікацыі твораў чачэнскіх пісьменнікаў. Па-беларуску загучалі вершы Алвадзі Шайхіева, Лулы Куні, Сайд-Магамеда Гелагаева, Асі Умаравай, Фаізы Халімавай, Адама Ахматукаева, Пецімат Петрымавай і іншых таленавітых чачэнскіх паэтаў.

Сяргей ШЫЧКО.

■ Літаратура

ПЛАНКА ПРЫГОЖАГА ПІСЬМЕНСТВА

«Звязда» ўшанавала пераможцаў конкурсу апавяданняў

У апошнія дні чэрвеня ў рэдакцыю «Звязды» завіталі пераможцы літаратурнага конкурсу, які ўжо шмат гадоў запар праводзіць газета, — каб яшчэ раз пачуць нашу падзяку за цікавыя і змястоўныя творы, абмяняцца ўражаннямі са старшынёй журы — вядомым пісьменнікам, дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесем БАДАКОМ, і, нарэшце, прайсці прыемную працэдуру ўзнагароджвання, атрымаўшы дыпломы лаўрэатаў і фірменныя звяздоўскія сувеніры. Праўда, у гарачы перыяд летніх водпускаў атрымалася сабраць толькі частку прызёраў — аднак астатнія некалькі дыпломаў і падарункаў таксама неўзабаве знойдуць сваіх гаспадароў.

Фота Кастуся ДРОБАВА.

Нагадаем, па выніках 2017 года пераможцай конкурсу журы выбрала **Кацярыну Захарэвіч** з апавяданнем «Морзэ на барвовай труне». «Канешне, прыемна і радасна, калі камусьці яшчэ падабаецца тое, што мы робім, — адзначыла маладая пісьменніца, — гэта матывуе і натхняе ўдасканальвацца, працаваць далей». Дарэчы, конкурсны твор аўтарка напісала ў адказ на выклік — трэба было пачаць аповед з пераліку пэўных рэчаў. «Рыдлёўка, ліхтарык, труна, манетка, жменька хлебных крошак» — з гэтага выросла «гісторыя пра асацыяльнага хлопца, які, тым не менш, мае багаты ўнутраны свет і пачуцці, на якія таксама трэба звяртаць увагу».

Другое месца заняла **Марыя Шэбанец (Бельская)** з апавяданнем «Краем вока». Гэты поспех, на думку прафесійных літаратараў, можа стаць добрым крокам да рэалізацыі даўняй мары паэткі і пісьменніцы — напісання вялікага рамана. А навукова-фантастычнае «Спадарожнік» з дэтэктыўна-гістарычнымі дэталямі прынесла братаўчаніну **Сяргею Белаяру** трэцяе месца.

Акрамя таго, журы вырашыла прысудзіць і дадатковы заахвочвальны прыз — **Святлане Локтыш** за апавяданне «Цыркачы», у якім на некалькіх старонках змясціліся лірыка і проза, крымінал і драма, а таксама эфектны фінал. Між іншым, Святлана — наша калега, доўгі час яна працавала журналістам у Ганцавічах і працягвае прафесійную дзейнасць у Мінску, а да напісання конкурснага твора яе падштурхнула таксама журналісцкая цікавасць: «зачапілася вокам» за маленькую заметку з залы суда, дзе маладога хлопца асудзілі за забойства жонкі. «Спачатку я мела іншую задумку, але героі пачалі дыктаваць свае ўмовы, і ў мяне муж аказаўся добры, харошы чалавек», — прызналася аўтарка.

— Што датычыцца конкурсу, я лічу, што гэта наогул вялікая ўдача, і не толькі для аўтараў-пачаткоўцаў, — надрукавацца ў «Звяздзе», грамадска-палітычным выданні, якое, па-першае, мае шырэйшае кола чытачоў, чым выданні літаратурныя, а па-другое, гэта менавіта тыя чытачы, для якіх кожны пісьменнік і працуе, — дадаў Алесь Бадак. — Бо мы пішам не толькі і не столькі дзеля таго, каб пачуць крытыку літаратуразнаўцаў, каб даведацца пра свае перавагі і хібы, а перад усім каб атрымаць водгук чытачоў. Невыпадкова конкурс існуе ўжо шмат гадоў. У свой час у ім удзельнічалі Іван Шамякін, Андрэй Федарэнка і многія іншыя вядомыя пісьменнікі, потым далучыліся не толькі прафесійныя аўтары, конкурс стаў насамрэч народным, і ў гэтым ёсць свая логіка — шукаць новыя таленты ва ўсіх кутках краіны, даць магчымасць чытачу адкрыць для сябе новыя імёны. Асобна адзначу, што ў апошнія гады дасланыя на конкурс творы дэманструюць шматжанравасць беларускай літаратуры: на старонках «Звязды» друкаваліся як класічныя апавяданні, так і гістарычныя, містычныя, дэтэктывы, фантастыка... І гэта, я лічу, стымулюе развіццё сучаснай літаратуры: чым больш разнастайная яна будзе, тым больш да яе будзе гарнуцца чытач.

Таму, шаноўныя чытачы і аўтары, мы не развіваемся, а распачынаем новы этап. Конкурс завершаны. Конкурс працягваецца!

Вікторыя ЦЕЛЯШУК

Увага! Літаратурны конкурс працягваецца

«Той, хто можа напісаць добрае апавяданне, можа напісаць і добры раман, — сцвярджае пісьменнік Алесь Бадак, які разам з нашай рэдакцыяй працягне курыраваць конкурс у 2018 годзе. — А вось той, у каго палёт і маштаб думкі дазваляюць напісаць добры раман, не заўжды здатны напісаць добрае апавяданне».

Вы належыце — альбо толькі збіраецеся ўвайсці — да ліку першых? Тады далучайцеся, калі ласка, да літаратурнага конкурсу «Звязды». Нагадаем яго галоўныя ўмовы:

— прымаюцца апавяданні на беларускай мове, якія раней нідзе не друкаваліся;

— разглядаецца толькі адно апавяданне ад аднаго аўтара;

— памер дасланага твора не павінен перавышаць 5 старонак (10—12 тысяч знакаў)!

Рэдакцыя пакідае за сабой права не рэцэнзаваць і не вяртаць творы.

Апавяданні, а таксама некалькі слоў пра сябе і асабістыя звесткі (сапраўдныя прозвішча і імя, дакладны паштовы адрас, кантактны тэлефон і поўныя пашпартныя даныя — нумар, кім і калі выдадзены пашпарт, асабісты нумар) накіроўвайце на адрас: **г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а, 220013, газета «Звязда»** з пазнакай «На літаратурны конкурс». Тэксты таксама прымаюцца ў электронным выглядзе на info@zviazda.by таксама з пазнакай «На літаратурны конкурс».

■ Кінакронікі

Недалёкія 1940-я

Серыя дакументальных фільмаў працягвае расказваць пра Мінскае гета

29 чэрвеня афіцыйная дэлегацыя з удзелам прэзідэнтаў Беларусі, Германіі і Аўстрыі прыняла ўдзел у мітынгу-рэквіеме памяці ахвяр нацызму на тэрыторыі былога лагера смерці Малы Трасцянец. У гэты ж дзень у мінскім Доме Масквы адбылася прэм'ера дакументальнага фільма «Зондэргета» — чацвёртай у «хроніцы Мінскага гета» карціне «Майстэрні Уладзіміра Бокуна». Рэжысёр Людміла Клінцова працягнула дакументальны аповед пра тое, як з Еўропы ў Мінск для знішчэння прывозілі эшалоны яўрэяў.

Нягледзячы на тое, што ў канцлагеры накіроўваліся не толькі дарослыя, але і дзеці, сёння можна знайсці тых, хто пазбег лёсу быць адпраўленым у Мінск разам са сваёй сям'ёй. Тады яшчэ дзеці, а сёння ўжо людзі ў гадах, каму цяжка ўспамінаць мінулае, могуць дапоўніць аповед пра «гамбургскіх» яўрэяў рэдкімі «жывымі» ўспамінамі. (Першы цягнік, усе пасажыры якога былі яўрэямі, прыбыў у Мінск у 1941 годзе з Гамбурга, і хоць пасля эшалоны прыходзілі і з іншых еўрапейскіх гарадоў, яўрэяў адтуль усё роўна называлі «гамбургскімі».)

Аўтары карціны «Зондэргета» звярнуліся да гэтага рэсурсу, што мы сёння яшчэ можам застаць, і знайшлі герояў, сем'яў якіх Мінскае гета датычыцца непасрэдна. Эдна Магдэр з Канады, Курт Маркс з Вялікабрытаніі і Міхаэль Розенберг з Германіі змаглі падзяліцца ўспамінамі пра блізкіх, што ў 1940-х былі адпраўленыя ў Мінск. Дакументальны фільм перадае сведчанне сваіх герояў і працягвае аповед пра Зондэргета, у якім раскрываюцца і лішні раз замацоўваюцца факты пра халакост на беларускай тэрыторыі.

У дэталях раскрываецца, напрыклад, «абыгрывание» адпраўкі тысяч людзей — усяго ў раён Мінска было накіравана амаль 24 тысячы чалавек — на смерць: кожны з іх думаў, што едзе жыць, забіраў дакументы і сертыфікаты ў надзеі атрымаць лепшую працу, сам аплачваў білет на цягнік. Фільм «Зондэргета» амаль не выкарыстоўвае эмацыянальны рэсурс, але перадае эмоцыю праз факт: інфармацыя, якая суправаджае гісторыю Мінскага гета, сённяшняга чалавека здольна моцна ўразіць (не выціснуць слязу, але ўсё ж). Адзінае, у кадр трапляе пара сцэн, дзе ў саміх герояў фільма на вочы наварочваюцца слёзы, і гэта дэманструе, як моцна трагедыя 1940-х адгукаецца ў сённяшнім дні. Запрасілі да ўдзелу і мінчан, якія помняць і часы, і эшалоны: на экране старажылка Мінска згадвае свае ўражанні ад новапрыбылых.

Нягледзячы на тое, што ў канцлагеры накіроўваліся не толькі дарослыя, але і дзеці, сёння можна знайсці тых, хто пазбег лёсу быць адпраўленым у Мінск разам са сваёй сям'ёй.

Характэрна, што «Майстэрня Уладзіміра Бокуна», якая займаецца гістарычным кіно, сродкі на чацвёрты фільм «Хронікі Мінскага гета» збірала з міру па нітцы. Бюджэт атрымаўся прадказальна недастатковы, таму прозвішчы і ролі ў здымачнай групе раз-пораз пераплятаюцца. Аўтарамі сцэнарыя сталі Барыс Герстэн, Уладзімір Бокун і Людміла Клінцова. Апошняя, як ужо згадвалася, стала і рэжысёрам, Уладзімір Бокун — прадзюсарам і аператарам, Барыс Герстэн з'яўляецца ў кадры з суправаджальным тэкстам.

Цікава таксама заўважыць, што фільм сродкамі паловы неабходнага бюджэту і неабыякавасці закранае тэму, якой павінны апекавацца хутчэй вялікія інстытуцыі са структуры ўлады. Часам гэтая тэма сапраўды з'яўляецца ў парадку дня Мінкульта, але той факт, што Мінскае гета становіцца аб'ектам увагі таксама прыватнай ініцыятывы, пацвярджае адзін з тэзісаў фільма «Зондэргета»: натуральная памяць аб трагедыі жывая

■ Фестываль

ШАЎКОВЫ ШЛЯХ У КІНО

«Лістапад» стаў часткай буйнога альянсу міжнародных кінафестываляў

Мінскі міжнародны кінафестываль «Лістапад» разам з яшчэ трыццацю міжнароднымі кінафестывалямі падпісаў мемарандум аб супрацоўніцтве, што, па словах праграмнага дырэктара нашага форуму Ігара Сукманава, «адкрывае перад фестывалем бязмежныя магчымасці».

Цырымонія адбылася на адкрыцці XXI Шанхайскага міжнароднага кінафестывалю, аднаго з найбуйнейшых кінафорумаў Кітая, які выступіў ініцыятарам такога кшталту аб'яднання і стаў у пэўным сэнсе пляцоўкай для кааперацыі. Слоган «Адзін пояс — адзін шлях», пад якім ствараўся новы альянс, нагадвае пра Вялікі шаўковы шлях, што ў свой час аб'ядноўваў Усход з Захадам: мемарандум, апроч «Лістапада», падпісалі прадстаўнікі кінафестываляў Канады, Егіпта, Грэцыі, Індыі, Лівана, Новай Зеландыі, Філіпінаў і больш блізкіх нам Літвы, Польшчы і Расіі.

Падпісаны дакумент заклікае да культурнага абмену сродкамі кіно, дапамагаць разуменню нацыянальных традыцый, арганізоўваць адпаведныя мерапрыемствы на кінафестывалях, што падпісалі мемарандум, запрашаць калег па альянсе да членства ў журы альбо ў якасці гасцей кінафестываляў, садзейнічаць распаўсюджванню нацыянальнага кіно.

«Мемарандум дае нам магчымасць напрамую стукацца ў дзверы, — кажа Ігар Сукманаў, які ўласнаручна падпісаў дакумент на шанхайскім кінафестывалі, — пашыраць кантакты і наладжваць больш інтэнсіўнае і «наварыстае» супрацоўніцтва. Нейкія намёткі, хоць яны і носяць рабочы характар, ужо ёсць: мы навялі масты з Новай Зеландыяй і Кітаем, ёсць перспектыва арганізаваць сумесныя спецыяльныя праграмы. Стварэнне альянсу аб'ядноўвае фестывалі, робіць іх больш згуртаванымі і дае ім неабмежаваныя магчымасці. Пашырэнне кантактаў, напрыклад, палегчыць атрыманне патрэбнага нам кіно, якое не мае еўрапейскага дыстрыб'ютара. Або дазволіць запрашаць на «Лістапад» прадстаўнікоў Балгарыі, Кітая, Польшчы ў якасці членаў журы, лектараў і прафесіяналаў для майстар-класаў. Адпаведна, мы папулярызуем ва ўсім свеце і свой фестываль».

Важна звярнуць увагу, што падпісаны дакумент карысны не толькі «Лістападу», а беларускай кінаіндустрыі ўвогуле — тэкст мемарандума заклікае ствараць працоўныя адносіны па кінапрадукцыі і дыстрыбуцыі.

Стварэнне альянсу пакажа ўсе свае магчымасці толькі з часам — такога кшталту фарміраванне наўрад ці здольна даць імгненны вынік, затое можа прапанаваць пэўную стратэгію, накіраваную на міжнароднае супрацоўніцтва. Так ці інакш, «шаўковы шлях» у кіно створаны, і ўдзел у ім «Лістапада» ў пэўным сэнсе датычыцца кожнага кінааматара, які шукае на вялікім экране нешта незвычайнае.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ

Алена СПІРЫДОВІЧ:

«СЁЛЕТНІ «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» СТАНЕ ДЛЯ МЯНЕ 26-м»

Заслужаная артыстка Беларусі Алена Спірыдовіч — нязменная спадарожніца фестывалю «Славянскі базар у Віцебску». Яна працавала на самым першым з усіх, на другім — стала вядучай канцэртаў. На сцэне віцебскага амфітэатра падчас адкрыцця фестывалю яна з'явіцца і сёлета. Пра «Славянскі базар», працу на тэлебачанні, ідэальны шлюб і многае іншае мы пагутарылі з тэлевядучай.

— Дарэчы, мая бабуля Ніна Іванаўна Казармшчыкава шмат гадоў адпрацавала ў «Звяздзе» машыністкай-стэнаграфісткай-перакладчыцай, — пачынае Алена Спірыдовіч. — Звяздоўцы заўсёды пра яе памяталі: прыязджалі дадому з кветкамі, падарункамі і сувенірамі, віншавалі са святамі. Найлепшыя бабуліны фотаздымкі на 80-гадовы, 90-гадовы юбілеі зроблены фотакарэспандэнтамі газеты. Яна заўсёды старанна рыхтавалася, хадзіла ў цырульню, рабіла прычоску, манікюр. Бабуля была маёй самай лепшай дарадчыцай, выдатна ведала беларускую мову, да апошняга яе дня ў любы час сутак я магла патэлефанаваць і спытаць, як па-беларуску лепш сказаць нейкі выраз, і яна давала такі прыгожы пераклад!

Часта на вуліцы мне людзі кажуць: «Ой, вы такая прыгажуня ў жыцці!» А я думаю: якой жа яны мяне бачаць па тэлевізары?

— Хутка чарговы раз вы з'явіцеся на сцэне на адкрыцці 27-га «Славянскага базару»...

— І для мяне ён будзе 26-м па ліку. На самым першым я не была вядучай, а працавала карэспандэнтам у «Дзённіках фестывалю». І адбылася тая вядомая гісторыя. Праграма тады выходзіла ў прамым эфіры. На адзін з уваходаў у амфітэатр ставілі камеру. Была група людзей — кампазітары, артысты, арганізатары, — якія да мяне па чарзе падыходзілі, я брала інтэрв'ю, расказвала штосьці пра фестываль. Дзённік ішоў 15 хвілін, да якіх я цалкам рыхтавалася. На трэці дзень канцэрт затрымалі на 20 хвілін. Пра гэта ведалі ўсе, акрамя групы «Дзённікаў». Я расказваю-расказваю, у мяне ўжо людзі скончыліся, а пазыўных фестывалю ўсё няма. Я адразу скажу, што не надта ганаруся тым эфірам. Я спыняла гледачоў, якія спазняліся, прыцягнула білецёрку, міліцыянера, у кагосьці выхапіла з рук фестывальную газетку і прачытала праграму на наступны дзень, хіба што толькі не пела і не танцавала. І трэба ж было такому здарыцца, што старшыня Белтэлерадыёкампаніі, а тады гэта быў Генадзь Мікалаевіч Бураўкін, уключыў тэлевізар паглядзець новую дзяўчынку на «Дзённіках». І сказаў: адпраўляйце яе назад у Мінск, прышліце кагосьці больш вопытнага. Пасля такой навіны ў свой нумар я не пайшла, бо ведала, што прарыдаю ўсю ноч. Пайшла ў кавярню, узяла каву. Падсаджваецца да мяне мужчына з суседняга століка, які аказаўся галоўным рэжысёрам фестывалю з Масквы (Сяргей Віннікаў. — **Аўт.**), кажа, што бачыў мой эфір. Ён загадзя ведаў, што канцэрт затрымліваецца, і адразу зразумеў, што гэтага не ведаю я. І вельмі забаўляўся тым, што адбывалася ў кадры. Зрабіў мне камплімент і сказаў, што хацеў бы, каб на наступны фестывальны год я выйшла на сцэну ў якасці вядучай. Глытаючы слёзы, я сказала, што мяне ўжо выгналі. Ён паабяцаў, што возьме на сябе гэты момант. А пазней мне патэлефанавалі мае калегі і сказалі, што прабіліся да Генадзя Мікалаевіча, усё яму растлумачылі, і мне далі яшчэ адзін шанц, таму я працягвала весці «Дзённікі».

Я заўсёды ўсміхаюся сама сабе, калі чую ад артыстаў, што Масква можа даць такую раскрутку, калі ў цябе ёсць грошы, што ты адразу станеш зоркай. У маім жыцці адбывалася наадварот: мяне запрашалі і мне плацілі грошы. На наш кінафестываль «Лістапад», дарэчы, мяне паклікаў Расціслаў Іванавіч Янкоўскі, калі сустрэўся са мной на сочынскім «Кінатаўры», дзе я вяла «Зорную дарожку». І такіх гісторый у маім жыцці нямала. І добра, што некаторыя з іх працягваюцца.

— Якім у вашай памяці застаўся першы «Славянскі базар» у ролі вядучай? Усім вы запомніліся незвычайнай прычоскай...

— Мне вельмі хацелася запомніцца. Я ж прыехала ўжо не проста як карэспандэнт, а як вядучая вялікага фестывалю. Што датычыцца ўласных валасоў, я заўсёды грашыла ўсялякай навізной. Рэжысёр Аляксандр Вавілаў, калі віншаваў мяне з 8 Сакавіка, напісаў вершы з радкамі пра мае эксперыменты з прычоскай: «Спірыдовіч, Спірыдовіч, галава — не палігон». Але на той момант мой галоўны эксперымент быў яшчэ наперадзе. Я прыехала ў Віцебск з нармальнай прычоскай, якую насілі сотні маладых дзяўчат. Але прыйшла да свайго сябра, майстра міжнароднага класа, ён трэніраваў нашу зборную па цырульніцкім майстэрстве. І папрасіла: зрабі так, каб мяне запомнілі. Першае, што ён зрабіў, — збрыў грыўку. Галава пасля стрыжкі стала падобнай на кабачок. Я калі ўбачыла сябе ў люстэрку, заплакала. Але ўдар я трымаю, таму выцерла слёзы і пайшла на вуліцу. У людзей, якія мяне сустракалі, такія дзіўныя твары рабіліся. Каб адразу спыніць усе размовы, я казала, што доўга марыла пра такую прычоску і мая мара ажыццявілася. Канешне, было вельмі соромна перад галоўным рэжысёрам фестывалю, падвоху ад мяне ён не чакаў. Але, як чалавек крэатыўны, сказаў, што нешта ў гэтым ёсць. У прафесіянальным плане мне прычоска дапамагла. Я так працавала! Быў суперстымул — даказаць, што я не проста фіфа, якая пастрыглася наперакор, каб не запомнілі. І гледачы да канца фестывалю даравалі мне стрыжку.

— Кожны наступны фестываль таксама трэба было здзіўляць, каб трымаць марку?

— Ні ў якім разе! Я пасля сябравала з майстрам шмат гадоў, але больш ніколі не садзілася да яго ў крэсла. А ён у адным з інтэрв'ю сказаў: «У маім крэсле плакала адна вельмі вядомая зараз вядучая. А апошнія пяць гадоў плачу я, бо яна не хоча мяняць прычоску».

— У вас заўсёды прыгожыя канцэртныя сукенкі. Што з імі адбываецца пасля?

— Частку захоўваю дома, частку — на тэлебачанні. Штосьці, дарэчы, нашу дагэтуль. З канцэртнымі касцюмамі не так проста развітацца, з кожным звязана свая гісторыя. І мая шафа змесціць яшчэ шмат дызайнерскіх эксперыментаў.

— Шыеце ўборы ў знакамітых мадэльераў?

— Калісьці даўно я, невядомая вядучая, падышла на паказе да невядомага мадэльера і сказала: «Мне так пададабаецца тое, што вы робіце. А я вядучая на тэлебачанні. Падумайце пра мяне». Так мы сталі з ёй кантактаваць. Ужо потым яна стала знакамітай, узначаліла Беларускі цэнтр моды, гэта вядомая Эльвіра Жвікава. Шмат гадоў мы з Элай працавалі, дагэтуль падтрымліваем цёплыя сяброўскія адносіны. Я ёй удзячная за пачуццё стылю, якое яна мне прывіла. Даўно ў маім жыцці з'явілася віцебскі дызайнер Таццяна Сычова. Сукенку яна ўмудраецца, дарэчы, пашыць за дзве прымеркі: адна тут, у Мінску, калі мы тканіну выбіраем, а другая ў Віцебску, за дзень да фестывалю.

З мужам Юрыем Брэусам.

— Вы вядучая праграмы «Белорусское времечко» на тэлеканале «Беларусь 1», «Беларуская кухня» на «Беларусь 3» і «Брацкая кухня» на тэлеканале саюзнай дзяржавы «БелРос». Гэта практычна штодзённы эфір, прычым у такіх розных перадачах. А «Белорусское времечко» ўвогуле ідзе ў прамым эфіры...

— Я вельмі люблю гэты праект, ён такі шчыры. Прамы эфір — гэта для мяне такі космас. Вельмі важная твая рэакцыя тут і цяпер, твае адчуванні, жыццёвы вопыт, пазіцыя. «Белорусское времечко» — той праект, які дае добры стымул працаваць, бо падчас кожнай праграмы знойдзецца некалькі ўдзячных чалавек, таму што мы вырашылі іх камунальныя, спажывецкія, чалавечыя праблемы. Значыць, не дарэмна працуем. Я, дарэчы, не люблю працаваць на знос, бо хочацца адчуваць задавальненне ад справы, якую робіш. Ну паспееш ты зрабіць некалькі праграм і канцэртаў за тыдзень, але задавальнення ад гэтага мала. Лепш спакойна адпрацаваць адзін канцэрт.

— З боку здаецца, што ў вас з Юрыем Брэусам ідэальны шлюб. Складана нават уявіць, што вы можаце пасварыцца...

— Канешне, можам, мы ж нармальныя людзі. Але тут мае значэнне, як сварыцца.

— І як?

— Пачынаецца з таго, што мой муж кажа: «Ведаеш, Алена...» І гэта ўжо канфлікт. Бо ніколі ў нармальным жыцці ён не называе мяне «Алена». Мы ніколі не павышаем голас адно на аднаго, не кажам крыўдных рэчаў — усё роўна ж потым давядзецца мірыцца. Калі мужу здаецца, што я не маю рацыі, ён бярэ мяне за рукі і моцна трымае, глядзіць у вочы і спакойна кажа, у чым я не маю рацыі. І гэта амаль збіццё немаўляці. Але я разумею, што ў большасці выпадкаў праўда на яго баку. Ёсць, дарэчы, вельмі добры спосаб не сварыцца. Для гэтага трэба болей размаўляць. Вось калі спакойна адносіны імкнешся высветліць, калі ведаеш, што можа пакрыўдзіць іншага, дакладна не захочаш зрабіць непрыемна чалавеку, якога кахаеш. Добрыя адносіны ў сям'і — гэта штодзённая праца, у тым ліку і над памылкамі... Вось я дзесьці прачытала: самае частае слова, якое ўжываецца пасля словазлучэння «сапраўдны мужчына»...

...павінен?

— Так. У 98 % выпадкаў. Ды нікому ён нічога не павінен. Трэба паглядзець на сябе і спытаць: а што ты павінна? Ніхто нічога не павінен ні табе, ні іншым людзям.

— Вельмі мудра. Да такога разумення прыйшлі ў другім шлюбе?

— Першы раз я выйшла замуж у 18 гадоў, зусім дзяўчынкай. А мужу было 29, гэта быў дарослы сфарміраваны чалавек. Калі я выходзіла замуж другі раз, а ў Юры гэта таксама быў другі шлюб, ён напісаў у сваёй запісной кніжцы, што гэта перамога надзеі над вопытам. Так і жывём дагэтуль.

— З сынам Юрыя ад першага шлюбу падтрымліваеце кантакт?

— Так, калі ён тут бывае. Сяброўства няма, бо павінна быць імкненне з двух бакоў. Але калі ён тут, мне здаецца, яму камфортна.

«Сяргей Віннікаў зрабіў мне камплімент і сказаў, што хацеў бы, каб на наступны фестывальны год я выйшла на сцэну ў якасці вядучай. Глытаючы слёзы, я сказала, што мяне ўжо выгналі».

— Вы з мужам часта ў раз'ездах. Для шлюбу гэта добра ці дрэнна?

— Самае страшнае ў маім жыцці ўжо было. Муж працаваў у Маскве сем гадоў, і мы не бачыліся па паўтара-два месяцы. Я не ўяўляю, як я пражыла гэты час. Мяне здзівілі некаторыя сяброўкі, якія сказалі: гэта такое шчасце, што ў вас няма будняў. Па-мойму, калі людзі кахаюць адно аднаго, яны павінны жыць разам. У нас гэта была вымушаная мера, звязаная з працай. Юра з'язджаў на адзін год — зарабіць грошы, а там у яго пайшла кар'ера. Для мужчыны гэта важна. Ён са мной раіўся, і я разумела, што не маю права трымаць яго дома. Мне не хацелася, каб ён калі-небудзь мяне гэтым папракнуў. Калі ў жыцці здарылася бяда (тэлевядучая страціла сына. — **Аўт.**) і я тут засталася адна, ён вярнуўся — звольніўся ў адзін дзень, каб быць побач.

— Прафесія тэлевядучай патрабуе пэўных ахвяр. Як падтрымліваеце прыгажосць?

— Ну якая там прыгажосць? Я такая, якая я ёсць штодзень. Часта на вуліцы мне людзі кажуць: «Ой, вы такая прыгажуня ў жыцці!» А я думаю: якой жа яны мяне бачаць па тэлевізары? У мяне ёсць знаёмыя касметолагі, якія ўмеюць рабіць масажы, маскі, і гэта незямная асалода. Іх рэкамендуецца рабіць два разы на год па дзесяць сеансаў. Але ёсць адна ўмова: пасля нанясення прэпаратаў у гэты дзень нельга карыстацца касметыкай. А такіх дзён у маім жыцці вельмі мала. Таму атрымліваецца не два разы на год, а адзін, прычым не дзесяць, а ў лепшым выпадку восем сеансаў. Уколы прыгажосці зрабіла адзін раз у жыцці — такі боль, мне не падыходзіць гэта працэдура. Ёсць свае сакрэты прыгажосці, але яны ў натуральным выглядзе. Мне лепш кудысьці паехаць, паесці фруктаў. Летам, дарэчы, нікуды не езджу — мне і тут добра. А зіму цяжка вытрымаць, больш за месяц без сонца не выношу. У канцы кастрычніка — пачатку лістапада я звычайна еду ў Сочы на штогадовы дзіцячы фестываль «Кінатаўрык». Летась у канцы лістапада два тыдні мы з мужам адпачывалі ў В'етнаме. Вада +30, тэмпература +35 — вельмі камфортны для мяне клімат. Пасля старога Новага года мяне зноў цягне пахадзіць басанож па пяску. Сёлета паехаць не атрымалася, і я ледзьбе перажыла гэтую зіму. Вось муж нядаўна вярнуўся з Пальма-дэ-Мальёркі, дзе яны плавалі з сябрамі на яхце. Я не паехала, бо не люблю такі адпачынак на вадзе. А Юра вярнуўся і сказаў, што ў яго было адно жаданне: узяць мяне ў ахапак і паехаць разам. Я задаволеная, што ён адпачыў, да таго ж паабяцаў, што абавязкова з'ездзім на Пальма-дэ-Мальёрку ўдваіх.

Алена КРАВЕЦ.

«Ой, рана на Йвана»



ПА ГАРЫЗАНТАЛІ: 3. «Ляці, ляці, ..., лаві, лаві, дружочак». З такімі словамі дзяўчаты на Купалле кідалі вянкі ў ваду. **9.** Тое, што, паводле павер'яў, імкнуцца на Купалле адабраць ад кароў ведзьмы. **10.** «Падняўся грыбнік да дня — ... ліпеня». З верша Е. Лось «Лірыка ліпеня». **11.** «А ў цёмным лесе агонь гарыць, // Каля агня ... сядзіць». З купальскай песні». **12.** «Эх, скошан ... — і зніклі краскі». З паэмы Я. Коласа «Новая зямля» («Летнім часам»). 14. Мянушка ўдава з «Кнігі джунгляў» Р. Кіплінга. **15.** Той, хто піша кнігі, стварае музыку. **16.** Шырокая праезджая дарога. **18.** Месца для захавання на зіму агародніны. **19.** На Яна ... п'яна, а на Пятро — у жыце ядро (прык.). **20.** Беларуская багіня вясны. **23.** У ліпені ... радуецца (прык.). **24.** Музычны лад. **25.** Тытул, які перадаваўся ў спадчыну. **28.** Селядзечны расол. **31.** Свойская жывёліна, у якую, паводле павер'яў, можа ператварыцца ў купальскую ноч ведзьма. **33.** Невялікая рэчка. **35.** Не ... корміць мужыка, а ліпеньская праца (прык.). **36.** Купальскі ... . Добры дух, які, паводле падання, ходзіць і збірае купальскія кветкі. **37.** «Агрэсіўная» расліна-абярэг. У купальскую ноч яе затыкалі за дзверы, каб перашкодзіць пранікненню чараўнікоў.

ПА ВЕРТЫКАЛІ: 1. Каляровае шкло, якое выкарыстоўваецца пры мазаічных работах. **2.** Прыйшоў Пятрок, ... дня ўвалок, прыйшоў Ілья-прарок — два часы ўвалок (прык.). **3.** Бачыць ..., ды рука не дацягнецца (прык.). **4.** Тое, што і мелодыя. **5.** У мусульман мужчынскі галаўны ўбор. **6.** Катэгорыя, падраздзяленне. **7.** Вялікі гістарычны перыяд. **8.** «Будзеш, маці, меці ў хаце // Долю, згоду і ...». З верша Я. Купалы «На Купалле». **13.** Ліпень — ...: маланкі кідае, дубы калечыць (прык.). **14.** Купальская зёлка. **17.** Разрыў- .... Магічнае зелле, з дапамогай якога нібыта можна адамкнуць любыя замкі. **18.** Шарсцяны дыван ручной работы. **21.** Шум, які ўтварае ўзнятая хваля. **22.** Паўночная палярная вобласць зямнога шара. **26.** «Проці Йвана ... мала, // Ой, рана на Йвана». З беларускай народнай песні «Ой, рана на Йвана». **27.** «Я ... ў полі збіраю, // Івана Купалу пераймаю». З купальскай песні. **29.** Пералётная птушка сямейства воранавых. **30.** Беларуская багіня вяснова-летняй урадлівасці. **32.** На Самсона (10 ліпеня) дождж — ... тыдняў то ж (прыкм.). **34.** Вялікае лісцевае дрэва.

Склаў Лявон ЦЕЛЕШ,
г. Дзяржынск.

Праверце, калі ласка, адказы

Па гарызанталі: 3. Вяночак. **9.** Малако. **10.** Лірыка. **11.** Купалка. **12.** Луг. **14.** Каа. **15.** Аўтар. **16.** Тракт. **18.** Капец. **19.** Баба. **20.** Лёля. **23.** Сонца. **24.** Мінор. **25.** Князь. **28.** Лёк. **31.** Кот. **33.** Рачулка. **35.** Сякера. **36.** Дзядок. **37.** Крапіва. **Па вертыкалі: 1.** Смальта. **2.** Час. **3.** Вока. **4.** Напеў. **5.** Чалма. **6.** Клас. **7.** Эра. **8.** Багацце. **13.** Грамаўнік. **14.** Купальнік. **17.** Трава. **18.** Кілім. **21.** Усплёск. **22.** Арктыка. **26.** Ночка. **27.** Зёлкі. **29.** Грак. **30.** Лада. **32.** Сем. **34.** Вяз.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	4.47	21.41	16.54
Віцебск —	4.29	21.39	17.10
Магілёў —	4.37	21.31	16.54
Гомель —	4.43	21.19	16.36
Гродна —	5.04	21.55	16.51
Брэст —	5.14	21.46	16.32

Месяц

Апошняя квадра 6 ліпеня.
Месяц у сузор'і Цяльца.

Імяніны

Пр. НАРАДЖЭННЕ ІААНА ПРАДЦЕЧЫ. Антона, Івана, Якава.
К. Кіры, Бенядзікта, Кірылы, Мяфодзія.

Фота Ліны МАЛІНІНАЙ.

ЗАЎТРА



Даты Падзеі Людзі

1913 год — нарадзіўся Саламон Гарэлік, Герой Савецкага Саюза. У гады Вялікай Айчыннай вайны на Паўднёва-Заходнім фронце — памочнік камандзіра роты танкавага палка, ваентэхнік 1-га рангу. Пад варожым агнём рамантаваў падбітыя танкі, удзельнічаў у баях як камандзір танка. 22 кастрычніка 1944 года ў баі пад Белгарадам танк, якім камандаваў Гарэлік, быў падбіты і загарэўся. Экіпаж не пакінуў машыны і змагаўся да апошняга снарада. Ён загінуў у гэтым баі.

1943 год — нарадзіўся Віктар Рэвінскі, беларускі вучоны ў галіне вылічальнай тэхнікі. Аўтар навуковых прац па стварэнні высоканадзейных хуткадзейных спецыялізаваных сістэм на базе нетрадыцыйных метадаў выканання арыфметычных аперацый і сучасных канцэпцый пабудовы высокапрадукцыйных вылічальных сістэм. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1991).

1948 год — нарадзілася Валянціна Ушакова, беларускі вучоны ў галіне педагогікі. Аўтар навуковых прац па праблемах прафесійнага інжынернага, педагагічнага, гуманітарнай адукацыі, развіцця вышэйшай адукацыі ў Беларусі.

1953 год — нарадзіўся Пётр Бібіла, беларускі вучоны ў галіне тэхнічнай кібернетыкі і інфарматыкі. Аўтар навуковых прац па аўтаматызацыі праектавання лічбавых сістэм і звышвялікіх інтэгральных схем. Распрацаваў метады сінтэзу лагічных схем, мовы і тэхналогію праектавання структур ЗВІС.

1953 год — нарадзіўся Генадзь Космач, беларускі гісторык. Вывучаў гісторыю Аўстрыі і Германіі 1920-х гг., гісторыю палітычных партый Германіі, савецка-германскія і беларуска-германскія адносіны ў XX стагоддзі. Аўтар падручнікаў для сярэдняй школы і ВНУ.

1863 год — нарадзіўся Уладзімір Дураў, рускі савецкі артыст цырка, клоўн, дрэсіроўшчык, пісьменнік і навуковец-зоапсіхолаг. Упершыню ў Расіі распрацаваў сістэму дрэсіроўкі, заснаваную на вывучэнні прыродных інстынктаў і рэфлексаў жывёл. Першым з дрэсіроўшчыкаў паклаў у аснову сваёй практыкі тэорыю ўмоўных рэфлексаў Івана Паўлава, стаў заснавальнікам новай рускай (так званай дураўскай) школы дрэсіроўкі.

1903 год — нарадзіўся Яўген Гіпіус, рускі этнамузыколаг. У 1927—1963 гг. працаваў у навуковых установах і музычных ВНУ Ленінграда і Масквы. Удзельнік фальклорных экспедыцый, у тым ліку у 1934-м у Беларускае Палессе. Распрацаваў тэарэтычныя праблемы запісу і націравання народных напеваў, сістэмнай тыпалогіі, параўнальнага вывучэння лакальных меладычных стыляў і шматгалосся, вызначыў канцэптуальныя напрамкі этнамузыкалогіі ў маштабах фундаментальнай навукі, спрыяючы стварэнню рознанацыянальных навуковых школ, у тым ліку беларускіх.

1908 год — нарадзіўся Герберт Рапапорт, кінарэжысёр, народны артыст РСФСР, лаўрэат Сталінскай прэміі.

1928 год — адбыўся першы палёт самалёта У-2, распрацаванага і пабудаванага ў СССР пад кіраўніцтвам канструктара Мікалая Палікарпава.

1983 год — 11-гадовая амерыканская школьніца Саманта Сміт адправілася ў СССР па запрашэнні Генеральнага сакратара ЦК КПСС Юрыя Андропава.

1998 год — у акваторыі Баранцавага мора быў ажыццёўлены першы ў свеце запуск штучнага спадарожніка Зямлі з падводнай лодкі.

УСМІХНЕМСЯ

Дзяўчына дзеліцца ўражаннямі аб хлопцы:

— А заляцаецца як прыгожа! Якія словы знаходзіць! Якія кветкі падае! Проста хоць ніколі не выходзь за яго замуж!

Калі мама лічыць, што вы шмат ясце і шмат спіце, значыць, гэта — не ваша мама!

Гэта — яе мама!

— Фіма, якая на вас прыгожая сукенка, каб я так жыў!

— Дык я і сама не горшая!

— Дык што ж мы чакаем? Здымайце, паглядзім...

Калі хочаце ўбачыць, як выглядае свет у чатыры раніцы, завядзіце ката.

І прыз кінаакадэміі за лепшую ролю дастаецца любому таксісту за вось гэтую мініяцюру, калі твая паездка каштуе 8 рублёў, але ты даеш 10, і пачынаецца адчынянне ўсіх бардачкоў, багажніка, капота, ускрыццё пакрышак і распілоўванне кузава ў пошуках 2 рублёў рэшты.

caricatura.ru

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: В. АНУФРЫЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 337 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ тэл./факс: 287 17 79,
РЭКЛАМЫ e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 2356.

Нумар падпісаны ў 19.30 6 ліпеня 2018 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12